

«ТАКІХ МУЖЧЫН АДЗІН НА МІЛЬЁН»

Сямейная газета

БЯЗДЗЕТНЫЯ... ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ

Сямейная газета





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 КАСТРЫЧНІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 211 (29325)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

*«Мы працягнем забяспечваць школы Беларусі сучаснай тэхнікай і абсталяваннем. Агульнавядома, што асновы будучага дарослага жыцця чалавека закладваюцца ў дзіцячым і юнацкім узросце. І да работы школ у нас таксама захаваецца самая пільная ўвага. Для стварэння сучаснага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, якое ўлічвае асаблівасці і патрэбы развіцця кожнага вучня, мы забяспечваем і будзем забяспечваць нашы школы сучаснай тэхнікай, абсталяваннем, нагляднымі дапаможнікамі. Гэта патрабуецца для таго, каб ажывіць урок, дапамагчы настаўніку зрабіць яго не толькі інфарматыўным, але і цікавым для кожнага вучня».*

# ВОСЕНЬ ДРЭЎ-ПАТРЫЯРХАЎ



Гомельскі парк — краса і сіла ў любую пару! Тут растуць дрэвы, узрост якіх сто і больш гадоў. Таму многія жыхары горада з задавальненнем адпачываюць пад шатамі дрэў-патрыярхаў, вераць, што іх моц перадаецца і чалавеку. Вось і гэтыя матулі з дзецьмі невыпадкова выбралі ясень-асілак, каб падсілкавацца дзівоснай энергіяй.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Дэпутаты ратыфікавалі пагадненне Беларусі і Расіі аб узаемным прызнанні віз.

• **Колькасць самазанятых грамадзян у Мінскай вобласці расце: у параўнанні з мінулым годам яна павялічылася на 17,2 %.**

• Віктарыны, кіналекторыі і спартыўныя турніры арганізуюць для сталічных школьнікаў на канікулах.

• **У Полацку на новай вытворчасці віна плануюць стварыць каля 80 рабочых месцаў.**

• Цэнтр па прадухіленні каранавіруснай інфекцыі будзе працаваць падчас правядзення Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульняў летам 2021 года ў Токіа.


ISSN 1990 - 763X

20211>

9 771990 763008


Ёсць рэзерв

# «ЯДЗЕРНАЯ» КАР'ЕРА

### Як рыхтуюць будучых атамшчыкаў

**Мінскі энергетычны каледж штогод будзе рыхтаваць па спецыяльнасці «Электрычныя станцыі» па 30 студэнтаў-бюджэтнікаў, а ў БНТУ сёлета з'явілася новая спецыяльнасць «Праектаванне і эксплуатацыя АЭС». Усяго ж з 2013 па 2020 год у краіне выпушчана ўжо больш за 950 спецыялістаў, больш за 30 % з іх працуюць на пляцоўцы будаўніцтва станцыі. Чаму настолькі важная высокая кваліфікацыя персаналу для работы на атамнай станцыі, дзе і як рыхтуюць спецыялістаў і што чакае іх пасля вучобы? Адказы на гэтыя пытанні падчас круглага стала ў БелТА далі эксперты.**

### Паводле вопыту МАГАТЭ

Кадравы патэнцыял, неабходны для паспяховага развіцця атамнай галіны, у Беларусі ўжо сфармаваны — на такім меркаванні сышліся ўсе ўдзельнікі круглага стала. Аднак краіна працягне падрыхтоўку новых спецыялістаў, каб стварыць прафесійны рэзерв для ядзернай энергетыкі.

Рашэнне аб падрыхтоўцы ўласнага персаналу для ядзернай прамысловасці было прынята яшчэ ў 2007-м, да зацвярджэння ідэі будаўніцтва Беларускай АЭС. Мінэнерга сумесна з НАН Беларусі ацанілі, якія спецыялісты для гэтага спатрэбяцца. Пры гэтым эксперты разумелі, што «закрыць» усе пазіцыі маладымі спецыялістамі не атрымаецца. Абавязкова спатрэбіцца каля 70 ключавых тэхнічных спецыялістаў з практычным вопытам работы на АЭС, нагадала **Лілія ДУЛІНЕЦ, намеснік дырэктара Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Міністэрства энергетыкі.**

СТАР. 3

Свая справа

# ЗБЕГЧЫ Ў... ГЛЫБІНКУ

### Гараджанін пераехаў у вёску і стаў фермерам

**Сяргей АЛАВЯННІКАЎ нарадзіўся ў Мінску, дзе правёў большую частку свайго жыцця. У вёсцы Вугалец, што на Пухавіччыне, яго бацькі купілі невялікі дамок — маці параіла яе знаёмая. І жанчына прыехала сюды, каб паглядзець, што гэта за вёска. Яе проста зачаравалі тутэйшыя мясціны.**

СТАР. 4



Парламенцкі дзённік

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

# «ВАЖНА ПАЧУЦЬ УВЕСЬ СПЕКТР МЕРКАВАННЯЎ»

**«Задачы, якія нам трэба будзе вырашаць у найбліжэйшы час, наўпрост звязаныя з падрыхтоўкай Усебеларускага народнага сходу, які павінен стаць платформай для абмеркавання пытанняў, што маюць лёсавызначальнае значэнне для будучыні Беларусі», — сказаў перад адкрыццём чарговага пасяджэння чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі яе старшыня Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**



Фота БелТА.

### «Спробы сарваць распачаты агульнанацыянальны дыялог не спыняюцца»

Ён заўважыў, што ў грамадскую дыскусію, разгорнутую ў рамках падрыхтоўкі да форуму ва ўсіх рэгіёнах, уключаючы ўсё больш беларусаў, прадстаўнікі практычна ўсіх слаёў грамадства, эксперты, найбуйнейшыя грамадскія аб'яднанні, бізнес-саюзы.

«Разам з тым спробы сарваць распачаты агульнанацыянальны дыялог не спыняюцца. З падачы шэрагу заходніх дзяржаў і некаторых безадказных замежных палітыкаў абстаноўка ў краіне бесперапынна нагнятаецца, гучаць заклікі да развалу эканомікі, а вулічныя акцыі набываюць усё больш радыкальны характар, — адзначыў спікер. — Органы ўлады, дзяржаўныя служачыя і звычайныя людзі, для якіх лёс Беларусі не проста гук, падвяргаюцца жорсткаму псіхалагічнаму ціску. Галоўнай ахвярай маніпуляцый пры гэтым становіцца моладзь — студэнты, школьнікі, якіх ініцыятары масавых беспарадкаў проста цынічна выкарыстоўваюць для рэалізацыі сваіх палітычных амбіцый».

Вельмі важна, лічыць Уладзімір Андрэйчанка, што абсалютная большасць беларусаў захоўвае спакой і здольнасць цвяроза ацэньваць сітуацыю.

«Дзякуючы іх узважанай, адказнай пазіцыі і выразным дзеянням праваахоўнікаў у інтэрнэт-правакатараў не атрымліваецца прывесці краіну ў хаос і анархію, — сказаў ён. — Гэта пацвярджаецца і стабільнай работай айчынных прадпрыемстваў, і асноўнымі вынікамі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь за дзевяць месяцаў».

### «На сустрэчах з выбаршчыкамі трэба знаходзіць агульную мову»

Парламентарый звярнуў увагу на тое, што беларускай эканоміцы ўдалося забяспечыць рост ВУП пасля яго прасядання ў першым паўгоддзі, назіраецца паступовае ажыўленне гаспадарчай дзейнасці, захоўваецца рост у сельскай гаспадарцы і будаўніцтве, пазітыўную дынаміку дэманструе прамысловая вытворчасць, маецца станоўчае сальда ў знешнім гандлі.

Спікер ніжняй палаты падкрэсліў, што на ўсіх, хто прымае сёння рашэнні ў дзяржаве, уключаючы парламентарыяў, ляжыць каласальная адказнасць.

«Нам ні ў якім разе нельга ўпусціць кантроль над сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй. Трэба трымаць руку на пульсе і ведаць, чым жывуць працоўныя калектывы. Бо забастоўка правалілася, паколькі людзі выдатна разумеюць, што яе наступствы цяжка ўдараць найперш па іх саміх. І мы павінны іх падтрымаць і словам, і справай», — сказаў ён і заклікаў калег на сустрэчах з выбаршчыкамі «вучыцца чуць адно аднаго і знаходзіць агульную мову».

Пры гэтым засяродзіцца, на думку парламентарыя, трэба на рэальных праблемах, якія кроўна датычацца кожнага грамадзяніна Беларусі. Ён нагадаў і пра неабходнасць удзелу ў падрыхтоўцы пакета бюджэтна-падатковых законапраектаў на наступны год не толькі профільных камісій Палаты прадстаўнікоў, але і ўсяго дэпутацкага корпуса.

«Вельмі адказнай задачай з'яўляецца і фарміраванне сацыяльна-эканамічнай палітыкі на чарговае пяцігоддзе, — дадаў Уладзімір Андрэйчанка. — З улікам тых падзей, якія сёння скальнаюць свет, цалкам відавочна, што нам спатрэбіцца прыняцце шэрагу прынцыпова новых рашэнняў. Перспектывы росту нацыянальнай эканомікі наўпрост залежаць ад таго, наколькі эфектыўна мы зможам задзейнічаць унутраны, перш за ўсё, інтэлектуальны патэнцыял».

Падрыхтоўка сацыяльна-эканамічнай стратэгіі развіцця краіны і дыялог па дасягненні грамадскай згоды — працэсы цесна ўзаемазвязаныя, паколькі краевугольным каменем тут з'яўляецца прынцып сацыяльнай дзяржавы, ад якога кіраўніцтва Беларусі не адмовіцца, заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

«Правільнасць такой пазіцыі пацвярджае і аналіз прапаноў, якія сёння актыўна гучаць на рэгіянальных дыялогавых пляцоўках. Таму ў гэтую дыскусію неабходна ўцягнуць як мага больш неабыякавых грамадзян і перш за ўсё тых людзей, якія адказна выконваюць свой грамадзянскі і прафесійны абавязкі, забяспечваючы тым самым эканамічны суверэнітэт нашай дзяржавы, — сказаў ён. — Важна пачуць увесь спектр меркаванняў, бо ў комплексе яны ўяўляюць сабой аб'ектыўны зрэз тых праблем, запытаў і чаканняў, якімі жыве сучаснае беларускае грамадства. Іх дэталёвае вывучэнне дазволіць нам больш выразна сфармуляваць пералік задач, на якія неабходна звярнуць асаблівую ўвагу ў выбарчых акругах і ў ходзе нашай заканатворчай дзейнасці».

### Дадатковая сацыяльная абарона для шматдзетных

Менавіта прынцып сацыяльнай дзяржавы пацвярджае законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях пенсійнага забеспячэння і дзяржаўнага сацыяльнага страхавання», які дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі ўчора ў другім чытанні.

«Дадзены законапраект аб'ядноўвае тры праекты законаў, два з якіх былі ўнесены на веснавую сесію і прыняты ў першым чытанні, і трэці паступіў у Палату прадстаўнікоў у жніўні з Савета Міністраў Беларусі, — паведаміў журналістам **дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Павел СІЛЬЧОНАК.** — Дакументам прадугледжваецца сацыяльная абарона і правы шэрагу грамадзян, у першую чаргу шматдзетных сем'яў, грамадзян з інваліднасцю і сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю, таксама закранае занятых у сферы аграэкатурызму, рамеснікаў і шэраг іншых катэгорый грамадзян».

Размова не толькі пра магчымасць назапашваць пенсію індывідуальным прадпрымальнікам, але і аб праве не плаціць страхавы ўнёсак у перыяд, калі працоўная дзейнасць па пэўных прычынах не вядзецца, удакладніў парламентарый.

Для маці, якія выхоўваюць чацвярых і больш дзяцей, а таксама маці або бацькаў дзяцей-інвалідаў прапаноўваецца скараціць працоўны стаж для налічэння працоўнай пенсіі. Акрамя таго, павялічваецца пенсійная надбаўка да сацыяльнай пенсіі для маці або бацькаў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю і працоўны стаж якіх перавышае 20 гадоў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Прыярытэты

# ДРАЙВЕРЫ РОСТУ

**Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Раман ГАЛОЎЧАНКА наведаў ААТ «Белшына».**



Фота БелТА.

Падчас свайго візіту на бабруйскае прадпрыемства кіраўнік урада пабываў на заводах буйнагабарытных шын і звышбуйнагабарытных шын. Зараз тут рэалізуецца некалькі інвестыцыйных праектаў. Адзін з перспектыўных кірункаў — стварэнне цэльнаметалакордных шын радыяльнай канструкцыі з пасадачным дыяметрам да 63 цаляў. У свеце існуе толькі тры вытворцы, якія на гэтым спецыялізуюцца, і «Белшына» ў спісе чацвёртая. На тэрыторыі СНД аналагаў такой вытворчасці няма.

Пасля знаёмства з рэалізацыяй інвестпраектаў прэм'ер-міністр правёў нараду з кіраўніцтвам «Белшыны», дзе быў разгледжаны ўвесь комплекс пытанняў развіцця прадпрыемства, яго далейшай трансфармацыі.

— Праекты, рэалізаваныя на «Белшыне», былі дастаткова фінансаваёмістыя, — адзначыў прэм'ер-міністр. — На жаль, не вельмі добра склалася рынкавая сітуацыя, якая б дазволіла хутка вярнуць сродкі. Мы разгледзелі, за кошт чаго магчыма было б гэта зрабіць хутчэй. Разлічваем, што той кантракт, які рэалізуецца па пастаўках кар'ерных самазвалаў, дасць штуршок і дазволіць рухацца далей больш упэўнена. Пэўныя пралікі на этапе планавання гэтага праекта былі, але яны не катастрафічныя і зараз выпраўляюцца.

На пытанне карэспандэнта «Звязды», ці здольна прадпрыемства самастойна фінансава аздаравіцца, кіраўнік урада адзначыў:

— Прадпрыемства ў стане самастойна абслугоўваць свае даўгі. Гэта звычайная практыка, усе прадпрыемствы развіваюцца за кошт заёмнага капіталу. І «Белшына» ў стане абслугоўваць свае пазыкі і крэдыты. Трэба працаваць над тым, каб зніжаць даўгавую нагрузку. Гэта адна са стратэгічных задач, якая стаіць перад прадпрыемствам. За апошні год нагрузка не вырасла і гэта добры знак. Нейкай дапамогі ад дзяржавы на дадзены момант прадпрыемству не патрабуецца.

Кіраўнік урада таксама адзначыў, што перад бабруйскім вытворцам шын стаяць пэўныя выклікі, якія звязаны з неабходнасцю стратэгічнай трансфармацыі галіны. Трэба паляпшаць аперацыйны прыбытак, па новаму выбудоўваць палітыку продажаў.

— Гэта тая канкрэтная работа, якая, магчыма, не бачна, але яна вельмі важная і знаходзіцца на кантролі ва ўрадзе, — падкрэсліў Раман Галоўчанка. — Мы не ўмешваемся ў гаспадарчую дзейнасць прадпрыемства, але маніторым і глядзім за тым, каб якасна планавалася работа. Ніякай «надзвычайшчыны» тут няма. «Белшына» — знакавае для краіны прадпрыемства, адзін з найбуйнейшых вытворцаў шын не толькі ў СНД, але па шэрагу пазіцый і ў свеце. Таму да гэтага прадпрыемства асаблівая ўвага. І мы вельмі сур'ёзна сочым за тым, каб яно мела выразныя і зразумелыя прагнозы сваёй работы на найбліжэйшы год.

На прадпрыемстве асвоена вытворчасць болей чым 300 мадэляў шын. За апошнія тры гады на серыйную вытворчасць было пастаўлена каля 70 новых тыпапамераў шын. Асноўнымі рынкамі збыту з'яўляюцца Расія і Украіна, усяго экспартныя пастаўкі ажыццяўляюцца больш чым у 60 краін свету. Перад прадпрыемствам пастаўлена задача павышаць экспартныя продажы, скарачаць дэбіторскую залежнасць, павышаць хадзімасць шын. Менавіта такі павінен быць стымул для росту вытворчасці і папаўнення абаротнымі сродкамі.

**Генеральны дырэктар ААТ «Белшына» Андрэй БУНАКОЎ** перакананы, што рэзервы для росту ёсць:

— Апошнія месяцы нашай работы якраз і даказваюць, што «Белшына» здольная генерыраваць прыбытак. Зразумела, што складана разлічвацца пры такой пазыковай нагрузцы, але работа збалансаваная. Мы можам своечасова разлічвацца з даўгамі, загрузіць вытворчасць на больш высокім узроўні і пры гэтым знізіць запасы нават на такім фоне. Вядома, нас стрымлівае пэўная сітуацыя, якая склалася на знешніх рынках. Але тым не менш за апошнія тры-чатыры месяцы мы ў паўтара раза выраслі ў аб'ёмах рэалізацыі. Драйверам росту для «Белшыны» з'яўляецца наш завод звышбуйнагабарытных шын. Наша задача — рэалізаваць праекты і загрузіць абсталяванне па максімуме. А таксама суправаджаць наш прадукт, бо ён мае патрэбу ў пэўным сэрвісе. Адным словам, перспектывы для росту ёсць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*г. Бабруйск.*

# ВЕДАЦЬ СІТУАЦЫЮ З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## Праблем з медыкаментамі і сродкамі індывідуальнай аховы няма

**Пра гэта паведаміла старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас нарады з медыкамі ў фармаце відэаканферэнцыі.**

«Калі будуць узнікаць нейкія пытанні, мы з вамі на сувязі, — перадае словы старшыні Савета Рэспублікі да кіраўнікоў устаноў аховы здароўя БелТА. — Буду ўключацца штотыднёва, каб ведаць сітуацыю з першых вуснаў, хоць валодаю інфармацыяй штодзённа».

Паводле звестак прэс-службы Савета Рэспублікі, асноўныя тэмы мінулай гутаркі — работа медыцынскіх устаноў краіны ва ўмовах COVID-19, меры эпідэміялагічнага рэагавання, забеспячэнне медыкаў ахоўнымі сродкамі, рэзерв медыкаментаў, гатоўнасць ложкавага фонду лячэбных устаноў і лагістыка перамяшчэння пацыентаў з рэгіянальных лячэбных устаноў ва ўстановы з больш высокім узроўнем аказання медДапамогі.

Наталля Качанава звярнула ўвагу на работу ўстаноў розлага ўзроўню — ад ФАПаў да рэспубліканскіх цэнтраў.

«Трэба прымаць усе меры для таго, каб аказваць кваліфікаваную дапамогу людзям. Мяркуючы па вашых справаздачах, у кожным рэгіёне ў нас дастаткова свабодных месцаў у бальніцах. Там, дзе не патрабуецца стацыянарнае лячэнне, пацыенты павінны атрымліваць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу амбулаторна», — адзначыла Наталля Качанава.

Гэта важна!

# ЗАСЦЕРАГЧЫ СЯБЕ І БЛІЗКІХ

**У краіне ад грыпу на сёння прывіта 35,3 % насельніцтва. Усяго сёлета плануецца прывіць не менш за 40 % усіх грамадзян і не менш за 75 % тых, хто знаходзіцца ў групе рызыкі. Аб гэтым расказала начальнік аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.**

— Гэтага дастаткова для эфектыўнай прафілактыкі захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі, у тым ліку на грып. Перыяд вакцынацыі звычайна доўжыцца з 1 верасня да 1 снежня, але мы імкнёмся да таго, каб прывіць насельніцтва раней, бо бачым да гэтага вялікую зацікаўленасць і неабходнасць. Вельмі высокі попыт з пачатку перыяду вакцынацыі быў на платныя вакцыны, якія хутка скончыліся, нягледзячы на тое, што іх закупілі ў большай колькасці ў параўнанні з мінулымі сезонамі.

Іна Карабан адзначыла, што па колькасці захворванняў на вострыя рэспіраторныя інфекцыі ў цяперашні час мы знаходзімся на неэпідэмічным узроўні, хоць і адзначаецца невялікі рост.

— Асноўную долю захварэлых складаюць дзеці — 54 %. Што датычыцца тых, хто ўваходзіць у групу павышанай рызыкі — гэта дзеці ва ўзросце ад шасці месяцаў да трох гадоў, дзеці і дарослыя з хранічнымі захворваннямі, тыя, хто стаіць на дыспансерным уліку, асобы ва ўзросце ад 65 гадоў, цяжарныя жанчыны, медыцынскія работнікі і іншыя. Таксама вакцынацыя патрэбна работнікам такіх сфер дзейнасці, як адукацыя, гандаль, грамадскае харчаванне, транспарт, камунальная сфера і іншыя.

**Загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка ВЫСОЦКАЯ** акцэнтавала ўвагу на тым, што ў краіне ад грыпу зараз вакцынавана больш за 85 % медыцынскіх работнікаў і больш за 80 % тых, хто працуе ва ўстановах з кругласутачным рэжымам знаходжання: гэта дзіцячыя дамы, школы-інтэрнаты і іншыя.

— Цяпер вельмі актуальная і прафілактыка рэспіраторных захворванняў, у тым ліку каранавіруса. Важна памятаць і выконваць пэўныя меры: па-першае, трымаць сацыяльную дыстанцыю не менш за метр-паўтара, а таксама прытрымлівацца прынцыпу сацыяльнага дыстанцыявання — абмяжоўваць колькасць сацыяльных кантактаў па-за межамі дома на 75 % і на рабоце мінімум на 25 %. Таксама важна насіць і, калі трэба, мяняць маску, перыядычна мыць рукі з мылам. Усё гэта дазволіць значна скараціць колькасць выпадкаў заражэння рэспіраторнымі інфекцыямі, у тым ліку грыпам і каранавірусам.

Вераніка Высоцкая заўважыла, што захаванне гэтых мер прафілактыкі цяпер вельмі важнае, бо ёсць бессімптомныя захварэлыя і тыя, у каго захворванне на каранавірус і грып знаходзіцца ў інкубацыйным перыядзе. Яны лічаць сябе здаровымі, таму знаходзяцца ў грамадстве. Пажылым людзям і тым, хто мае якое-небудзь хранічнае захворванне, неабходна прытрымлівацца больш жорсткага варыянта сацыяльнага дыстанцыявання і абмяжоўваць кантакты настолькі, наколькі гэта магчыма.

У гэты перыяд асабліва важна надаваць увагу комлекснаму і рацыянальнаму харчаванню, аб гэтым расказала **загадчыца аддзела грамадскага здароўя і сацыяльна-гігіенічнага маніторынгу Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Анастасія КОСАВА.**

— Рацыён павінен утрымліваць паўнавартасную колькасць бялкоў, тлушчаў, вугляводаў, мікра- і макраэлементаў. Трэба аддаць перавагу збожжавым, гародніне і садавіне, якія з'яўляюцца крыніцай клятчаткі, таксама імбіру, куркуме, лімону, кісламалочным прадуктам, мясу, рыбе. Вельмі важна ўжываць тлушчы, таму аддавайце перавагу чырвонай рыбе і курыным яйкам. Не варта забываць і пра негазіраваную ваду, піць у дзень прыкладна 1,5-2 літры. Калі хтосьці захварэў на грып або іншыя вострыя вірусныя інфекцыі, яго ежа ў разгар захворвання павінна быць лёгкая, найлепш — прыгатаваная пры дапамозе пары, каб залішне не нагрузіць арганізм. Варта есці часта і маленькімі порцыямі, а таксама абмяжоўваць ужыванне спецый і солі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# «ЯДЗЕРНАЯ» КАР'ЕРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Такім чынам яшчэ ў 2008-м была распрацавана спецыяльная Дзяржаўная праграма падрыхтоўкі кадраў для ядзернай энергетыкі на 2008—2020 гады. Падчас навучання спецыялістаў у Беларусі абапіраюцца на міжнародны вопыт у сферы падрыхтоўкі персаналу, а таксама на веды, якія закумуляваны ў Міжнародным агенцтве па атамнай энергіі (МАГАТЭ).

*— Пры рэалізацыі сваёй ядзерна-энергетычнай праграмы Беларусь выкарыстоўвае метадалагічны падыход «Вехі», які спецыяльна распрацаваны МАГАТЭ для краін, дзе будуецца першы рэактар. Гэта методалогія прадугледжвае стварэнне адпаведнай інфраструктуры ядзернай энергетыкі, якая павінна быць развіта па 19 кірунках. І адзін з іх — падрыхтоўка персаналу. Гэты аспект чырвонай ніткай праходзіць праз усе кірункі работы на АЭС, дзе патрабуюцца спецыялісты адпаведнай кваліфікацыі. Менавіта таму пытанням падрыхтоўкі персаналу надаецца самая пільная ўвага, —* падкрэсліла Лілія Дулінец.

## Для АЭС і энергасістэмы

З 950 спецыялістаў, якіх падрыхтавалі ў Беларусі па пяці асноўных спецыяльнасцях, трэцяя частка трапіла на пляцоўку будаўніцтва АЭС, яшчэ адна — у арганізацыі, звязаныя з ядзернай энергетыкай і крыніцамі іанізуючага выпраменьвання. Астатнія — у сумежныя з ядзернай энергетыкай галіны. Цяпер профільную адукацыю, звязаную з работай у ядзернай галіне, атрымліваюць каля 500 студэнтаў.

*— Толькі сёлета на АЭС прыйшлі 32 спецыялісты са ста выпускнікоў. Перадавік у гэтым кірунку — БНТУ. Цяпер патрэбы станцыі ў кадрах задаволены цалкам, як і ўсёй энергасістэмы краіны, —* расказаў **Мікалай МАРУДА, кансультант упраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі.**

У межах плануемай ледзьве не на стагоддзе работы АЭС актуальнымі застаюцца пытанні перыядычнай ацэнкі бяспекі ядзерных энергаблокаў, вывад з эксплуатацыі, абыходжанне з адпрацаваным палівам і іншыя. Таму патрэба ў навучанні спецыялістаў і папаўненні інфраструктуры ядзернай энергетыкі існуе і надалей.

Згодна з праграмай на 2021—2025 гады, 30 навучэнцаў будуць атрымліваць сярэднюю спецыяльную адукацыю ў Мінскім энергетэтычным каледжы па спецыяльнасці «Электрычныя станцыі». Гэта дазволіць у будучым мець рэзерв спецыялістаў да 500 чалавек. Гаворка ідзе ўжо пра выпускі 2025—2030 гадоў, удакладніў Мікалай Маруда.

За час дзеяння Дзяржпраграмы БНТУ выпусціў 187 інжынераў-энергетыкаў па спецыяльнасці «паратурбінныя ўстаноўкі АЭС», з якіх амаль сто размеркаваны на работу на атамную станцыю. Тут жа працуюць і выпускнікі іншых кафедр універсітэта.

*— У рамках Дзяржпраграмы мы пашырылі лабараторную базу, закупілі сучаснае абсталяванне. За дастойную работу МАГАТЭ падарыла ўніверсітэту адмысловы трэнажор для вучобы, —* падзяліўся **Мікалай КАРНІЦКІ, загадчык кафедры «Цеплавыя электрычныя станцыі» энергетычнага факультэта БНТУ.** *— Мы і самі вучыліся, і студэнтаў вучылі, падрыхтавалі звыш 15 дапаможнікаў пад грыфам Мінадукацыі, неаднаразова павышалі кваліфікацыю ў розных ядзерных цэнтрах. Нашы студэнты праходзяць практыку на дзеючых АЭС, набываюць адпаведны вопыт.*


Фота БелТА.

Час дыктуе новыя ўмовы, і ў рамках існуючай спецыяльнасці прафесіяналам стала «цесна». Таму сёлета ва ўніверсітэце з'явілася спецыяльнасць «Праектаванне і эксплуатацыя АЭС». «Неўзабаве станцыя запрацуе, і мы павінны быць гатовыя яе эксплуатаваць», — патлумачыў Мікалай Карніцкі.

З 2016 года ў рамках Дзяржпраграмы працуе вучэбна-трэніровачны цэнтр АЭС. Яго работу высока ацанілі эксперты з МАГАТЭ і будуць раіць падобную практыку іншым краінам, падкрэсліў **Аляксандр ЕРЫН, намеснік начальніка вучэбна-трэніровачнага цэнтра БелАЭС:**

*— Мы распрацавалі ўсе неабходныя патрабаванні да вучэбна-трэніровачных сцэнарыяў, вучэбнай дакументацыі і тэхнічных сродкаў навучання. У прыватнасці поўнамаштабны трэнажор, на якім эфектыўна вучаць персанал блочнага пульта кіравання і іншыя лакальныя трэнажоры.*

Штогод у цэнтры праходзяць практыку да сотні студэнтаў.

**Ірына СІДАРОК.**

А не шкодзь!

# Білі рыбу токам,

### чым нанеслі прыродзе велізарны ўрон

**Пацярпела ад току фаўна ракі Сож у Слаўгарадскім раёне. Там «адзначыліся» двое браканьераў, жыхароў Чавусаў і Магілёва. Раніцай яны вярталіся на машыне дадому. Патрабаванне інспектараў спыніцца для праверкі не выканалі, па дарозе сталі выкідваць з аўто доказы віны — пераўтваральнік току, вясло, ручку сачка з правадамі.**

Вось толькі рыбу выкінуць не змаглі, бо яе аказалася нямала — ажно 206 асобін (у асноўным шчупак). Апраўданні браканьераў заўсёды выглядаюць недарэчна: то рыбу яны купілі, то знайшлі... Пазней затрыманыя ўсё ж сказалі праўду. Цяпер ім трэба будзе кампенсаваць нанесеную прыродзе шкоду — заплаціць каля 2,5 тысячы базавых велічынь.

Яшчэ адзін выпадак затрымання з электравудай адбыўся на рацэ Заходняя Бярэзіна ў Валожынскім раёне. Праўда, тут браканьер яшчэ толькі-толькі «разматаў» забароненую прыладу і не паспеў здабыць рыбы. Нягледзячы на гэта яго таксама чакае крымінальная адказнасць. Акрамя кампенсацыі шкоды за ўлоў, сам факт здабычы рыбы з дапамогай электралавільнай прылады цягне сур'ёзнае пакаранне — буйны штраф, арышт, абмежаванне або пазбаўленне волі.

Як расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, здабыча рыбы электралавільнай прыладай — адзін з самых варварскіх спосабаў браканьерства. Што ўяўляе сабой так званая электравуда? На самай справе гэта сачок з правадамі, па якіх ідзе ток ад звычайнага аўтамабільнага акумулятара. Напружанне на выхадзе можа дасягаць 1500 вольт, а радыус дзеяння — больш за дзесяць метраў.

З дапамогай электравуды браканьеры за кароткі перыяд вычэрпваюць з вадаёма сотні асобін рыбы. Але гэта далёка не ўся шкода, якая наносіцца водным рэсурсам: вялікая колькасць «зачэпленай» токам рыбы ідзе на дно, а ацалелыя асобіны губляюць здольнасць да ўзнаўлення. Часам рыба выжывае, але атрымлівае калецтва — ад маланкавай сутаргі ў яе можа скрывіцца пазваночнік. Пад уздзеяннем току гінуць і больш дробныя водныя насельнікі — жучкі, жабы, планктон, водарасці.

Таму пры разліку шкоды, нанесенай прыродзе электрабраканьерамі, прымяняецца пяціразовы памнажальны каэфіцыент. Выніковая сума прад'яўляецца да выплаты парушальнікам, і незаконны набытак становіцца для іх сапраўды «залатым». Тыя, хто бярэ ў рукі электравуду, выдатна ведаюць, чым гэта можа скончыцца, бо Дзяржінспекцыя неаднаразова паведамляла пра такія парушэнні і іх наступствы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Егіпет, Эфіопія і Судан пагадзіліся аднавіць дыялог па плаціне на Блакітным Ніле

Перамовы па плаціне «Адраджэнне» аднаўляюцца праз амаль тры месяцы пасля іх прыпынення. Пра гэта паведаміла Міністэрства водных рэсурсаў і ірыгацыі Егіпта. Адпаведная дамоўленасць была дасягнута на правядзенай у рэжыме відэаканферэнцыі сустрэчы кіраўнікоў МЗС і міністэрстваў водных рэсурсаў і ірыгацыі трох краін. «Егіпет пацвердзіў на сустрэчы важнасць дасягнення пагаднення аб прынцыпах запаўнення і эксплуатацыі плаціны, якое абароніць агульныя інтарэсы трох краін і забяспечыць іх патрэбы ў вадзе», — адзначаецца ў заяве ведамства. Бакі дамовіліся, што Судан у якасці старшыні гэтага новага раўнда перамоў арганізуе тыднёвыя кансультацыі, падчас якіх бакі засяродзяць асноўную ўвагу на пераглядзе праекта фінальнага пагаднення. Дакладныя тэрміны перамоў пакуль не абвешчаны.

## Эрдаган падаў у суд на Charlie Hebdo



Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган падаў у суд на французскі сатырычны часопіс Charlie Hebdo за публікацыю яго карыкатуры на вокладцы, паведамляе тэлеканал TRT. Чарговы нумар вядомага выдання выйшаў з карыкатурай на Эрдагана, аўтары якой імкнуліся паказаць чытачам, што паводзіны турэцкага кіраўніка далёкія ад нормаў ісламскай этыкі. Сам турэцкі прэзідэнт заявіў на гэта, што «ворагі ісламу», якія апублікавалі карыкатуру, «утопіцца ў балоце нянавісці і варожасці». Паводле інфармацыі тэлеканала, іск у пракуратуру Анкары супраць кіраўніцтва часопіса падаў ад імя Эрдагана яго адвакат Хусейн Айдын. У яго заяве сказана, што публікацыя часопіса не адпавядае маральным і этычным прынцыпам журналістыкі, паняццю «свабода слова», а таксама парушае гонар і годнасць турэцкага лідара.

## NASA знайшло ваду на Месяцы

Стратасферная абсерваторыя інфрачырвонай астраноміі SOFIA выявіла сляды вады на сонечным баку Месяца. Дагэтуль падобнае лічылася немагчымым. «Дадзенае адкрыццё сведчыць аб тым, што вада можа распаўсюджвацца па ўсёй месяцовай паверхні, а не толькі ў халодных, зацемненых месцах», — адзначылі ў NASA. Вада была знойдзена ў кратары Клава, размешчаным у Паўднёвым паўшар'і Месяца. «Пакуль невядома, ці зможам мы выкарыстоўваць яе як рэсурс. Пошук вады на Месяцы мае ключавое значэнне для нашых даследчых планаў у рамках праграмы Artemis (запланаваная на 2024 год высадка амерыканцаў на Месяц)», — напісаў у «Твітэры» дырэктар NASA Джым Брайдэнстайн. Выкарыстоўваць знойдзеную ваду як рэсурс насамрэч будзе няпроста — пакуль што яе канцэнтрацыя на Месяцы ў 100 разоў меншая, чым у пустыні Сахара.

Добрая акцыя

# ЖАНЧЫНЫ СТВАРАЮЦЬ АЛЕІ МАЦІ

**Актывісткі Беларускага саюза жанчын высадзілі ў кастрычніку сотні дрэў па ўсёй краіне. У знак адзінства, міру і згоды на некаторых дрэвах завязвалі зялёна-чырвоныя стужачкі.**



Актыў Саюза жанчын Салігоршчыны высаджвае сасновыя дрэвы.

— Па ініцыятыве прэзідыума БСЖ у гэтым годзе ў рамках тыдня маці аб'яўлена рэспубліканская акцыя «За Беларусь!», — сказала на адкрыцці рабінавай алеі ў Слоніме **старшыня Беларускага саюза жанчын Алена БОГДАН.** — У ёй прымаюць удзел актывісткі жаночага руху, жанчыны розных сфер дзейнасці і прафесій, якія выступаюць за захаванне міру і стабільнасці ў краіне.

Між іншым, толькі на Гродзеншчыне больш за 700 дрэў нядаўна ўпрыгожылі населеныя пункты. Дзевятнаццаць бярозавых, рабінавых, кляновых, туевых, ліпавых алей закладзены ва ўсіх рэгіёнах Прынямоння.

— Пасадка дрэў — гэта пасланне ў будучыню, бо яны будуць радаваць сваёй прыгажосцю нашых дзяцей і ўнукаў, — упэўнена **лідар жаночага руху Воранаўшчыны Алена ЯСТРЭМСКАЯ.** — Жанчыны павінны заўсёды несці творчы і пазітыўны пачатак. Гэтаму спрыяе і закладка алей.



26 бярозак з'явіліся 26 кастрычніка на праспекце Энергетыкаў і ў Астраўцы:

«Жанчыны нашага краю — за мірнае спакойнае жыццё ў Беларусі і ўпэўненасць у заўтрашнім дні, — сказала **лідар жаночага руху Астравеччыны Наталля БАНІЦЭВІЧ** падчас пасадкі бярозавай алеі. — Жанчыны кожнага раёна далучыліся да добрай кастрычніцкай акцыі».

Штогод 14 кастрычніка ў Беларусі адзначаецца Дзень маці, заснаваны Указам Прэзідэнта ў 1998 годзе па ініцыятыве Беларускага саюза жанчын. Да правядзення Дня маці прымеркаваны і Тыдзень маці, падчас якога па ўсёй краіне праводзяцца святочныя мерапрыемствы — сустрэчы, конкурсы вершаў і сачыненняў, выстаўкі дзіцячай творчасці, святочныя канцэрты, вечары адпачынку. Арганізавана ўшанаванне шматдзетных і маладых маці, віншаванне пажылых жанчын, якія пражываюць у дамах-інтэрнатах, дамах для ветэранаў, якія знаходзяцца ў шпіталях сястрынскага догляду, наведванне дому адзінокіх пажылых жанчын. Традыцыйна да Дня маці прымеркаваны пасадкі кастрычніцкіх алей Маці.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Сацыяльная абарона

# БЮДЖЭТ ПРАЖЫТАЧНАГА МІНІМУМУ ПАВЯЛІЧЫЦЦА

## «Дзіцячыя» выплаты таксама падрастуць

**З 1 лістапада ў Беларусі будзе павялічаны бюджэт пражытачнага мінімуму. Гэты паказчык вырасце з Br256,1 да Br258,11 і будзе дзейнічаць да канца студзеня 2021 года, паведамляе БелТА. Памеры бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах зацверджаны пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ад 23 кастрычніка 2020 года № 95.**

БПМ у сярэднім на душу насельніцтва ўстаноўлены на 0,8 % вышэй у параўнанні з нарматывам, які дзейнічае з 1 жніўня да 31 кастрычніка, адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Памеры бюджэту пражытачнага мінімуму па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах наступныя:

✓ працаздольнае насельніцтва — Br285,68;
✓ пенсіянеры — Br195,15;
✓ студэнты — Br248,06;
✓ дзеці ва ўзросце да трох гадоў — Br165,18;
✓ дзеці ад 3 да 6 гадоў — Br228,85;
✓ дзеці ад 6 да 18 гадоў — Br278,16.

Уключаныя ў сістэму сацыяльнай абароны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічаюцца ў залежнасці ад памеру БПМ, таксама зменяцца прапарцыянальна росту бюджэту пражытачнага мінімуму. Гэта памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, сацыяльныя пенсіі, даплаты пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, дапамогі па доглядзе за інвалідам I групы альбо за асобай, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, надбаўкі і павышэнні да пенсій, якія прадугледжаны для асобных катэгорый пенсіянераў. Гэтыя выплаты павялічваюцца суразмерна росту БПМ на 0,8 %.

У прыватнасці, з 1 лістапада павялічыцца памер дзіцячых дапамог.

✓ Аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці цяпер складзе Br 2581,1 (10 БПМ).

✓ Пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — Br 3613,54 (14 БПМ).

✓ Аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, з 1 лістапада будзе выплачвацца ў памеры Br 258,11.

Штомесячная дапамога сем'ям на дзяцей, старэйшых за тры гады, з асобных катэгорый сем'яў, якія вызначаюцца заканадаўствам, складзе:

* на дзіця-інваліда — Br 180,68;
* на іншых дзяцей у сям'і — Br 129,06.

# ЗБЕГЧЫ Ў... ГЛЫБІНКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мая матуля вырасла ў дзіцячым доме, дзе цяжка было знайсці месца, каб адпачыць адной. А тут ускраек лесу, паблізу няма суседзяў, паўсюдна спакой і цішыня. Пазней на ўчастку пабудавалі вялікую, адмысловую жылую пабудову, а старую знеслі, — згадвае Сяргей Алавяннікаў. — Маці вельмі баялася, што пасля яе смерці сядзіба прыйдзе ў заняпад, маўляў, тут кожная дошчачка кранутая маёй рукой.

Сяргей Алавяннікаў мае добрую кватэру ў Мінску, дзе жыве сям'я. Але больш як два дні не можа там знаходзіцца — цягне ў Вугалец. Мой суразмоўнік прывычны да сялянскай працы. У свой час маці і айчым, калі пераехалі ў гэтую вёску, завялі коз, трусоў, свіней, кароў, нутрый ды іншую жыўнасць. Вядома, хлопец дапамагаў ім упраўляцца з хатнімі клопатамі. Больш таго, ён вельмі палюбіў прыроду, гэты ціхі і спакойны куточак, без якога і цяпер не ўяўляе свайго жыцця.

У фермера цяпер гектар зямлі, дзе пабудаваныя памяшканні для шматлікай птушкі і жывёлы. У шэдах утрымліваюцца трусы розных парод, у тым ліку і экзатычных для Беларусі.

— Я пачынаў з дзесяці жывёлін, а цяпер іх цяжка злічыць. Трусагадоўля — вельмі клапотная справа, якая патрабуе асаблівых ведаў. Вушастыя вымагаюць карпатлівага догляду, для іх абавязковая вакцынацыя, паколькі яны схільныя да шматлікіх хвароб. Калі даўней ім можна было даваць траву, агародніну, то цяпер ад той жа капусты ў гэтых жывёл раздувае жываты. Гаспадар купляе для сваіх гадаванцаў спецыяльны камбікорм. Дапамагае Сяргею Міхайлавічу даглядаць за жывёламі Наталля Зялецкая.

— Я дырэктар фірмы, а Сяргей Міхайлавіч мой намеснік, — жартуе яна. — А калі сур'ёзна, то варта ведаць усе нюансы абыходжання з трусамі, усё рабіць з любоўю. Да кожнага трэба індывідуальны падыход, як да дзяцей.

Мяса трусоў фермер здае оптам — гандляваць на рынку не стае часу. Прадукцыю набываюць і пункты грамадскага харчавання. Купляюць мяса трусоў жыхары вёскі, Пухавіцкага раёна, індывідуальныя прадпрымальнікі.

А яшчэ фермер супрацоўнічае з некалькімі навукова-даследчымі інстытутамі, дзе на яго гадаванцах выпрабоўваюць вакцыны і лекі ад розных хвароб. Хтосьці скажа, што гэта негуманна. Але дзякуючы даследаванням, магчыма, удалося выратаваць жыццё не аднаго чалавека.

— А вось тут у мяне стаіць свінаматка, прывяла дзевяць парасят, аднаго пакінуў сабе, астатніх разабралі людзі.

У другім хлеўчуку рохкаюць два агромністыя белыя кабаны, дзесьці па 400 кілаграмаў кожны. «Гэта мясная парода», — растлумачыў гаспадар.

У абавязкі жанчыны ўваходзіць і даенне кароў.

— Яны айчыннай чорна-стракатай пароды. Добрыя рагулі, даюць шмат малака. Цяпер дзвюх запускаю, бо ў снежні яны будуць цяліцца. А так надойваю па 25 літраў у дзень ад кожнай. З малака робім тварог дзедаўскім спосабам — адтопліваем у печы. Для атрымання масла выкарыстоўваем механічную «круцёлку». А ў двары ў спецыяльных вальерах кудахча незлічоная колькасць нясушак. Якімі карыстаюцца попытам у шматлікіх спажыўцоў.

Фермерскую прадукцыю ахвотна купляюць жыхары вёскі. Ёсць пастаянныя кліенты, якія робяць папярэднія заказы. Акрамя таго, вяскоўцы ўдзячныя фермеру і за тое, што ён забяспечвае іх гноем па прымальных цэнах, ды яшчэ і дастаўляе ўгнаенне на сваім транспарце.

— А вось гэта лежабокі, — усміхаецца Сяргей Міхайлавіч і паказвае на паўлінаў. — Трымаю для прыгажосці.

Гэтыя велічныя птушкі любяць семачкі, зерне, яблыкі. Апошніх у садзе дастаткова: пладовыя дрэвы прывівае сам гаспадар.

На ўскрайку саду знаходзіцца пчальнік — усяго сямнаццаць вулляў. Мёд фермер збірае летам — з кожнага доміка ў залежнасці ад надвор'я бывае і па дваццаць кілаграмаў: рапсавы, лугавы, грэцкі. Воддаль у невялікай сажалцы плавае рыба. Калісьці Сяргей Алавяннікаў запусціў сюды малькоў карпа.

— А яшчэ Сяргей Міхайлавіч любіць збіраць грыбы, лавіць рыбу — непадалёк працякае чысцютка рака Волма, дзе водзіцца і шчупак, і сом, і лешч, — кажа **старшыня Турынскага сельвыканкама Святлана ХАРЫТОНЧЫК.** — Ён таксама і заўзяты паляўнічы.

Сапраўды, пра гэта сведчаць шматлікія атрыбуты і здабытыя трафеі. Падчас палявання яго суправаджаюць верныя памочнікі — эстонскі ганчак Лайм і рускі ганчак Флейта.

— А ці ёсць намер пашырыць сваю гаспадарку? — пацікавілася ў Сяргея Алавяннікава на развітанне.

У адказ ён паказаў будынак, які стаіць асобна, дзе фермер плануе стварыць аграсядзібу і ўжо прыступіў да яе ўладкавання. «Прыязджайце праз два гады, — запрасіў ён. — Тут можна будзе адпачыць і папарыцца». А гэты гаспадарлівы і руплівы чалавек не прывык адступаць ад задуманага і паслядоўна дабіваецца сваёй мэты.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**



Сямейная газета
Выпуск № 20 (156)

## СУМЕСНЫ СОН: ХТО «ЗА»?

*Дзве мае блізкія сяброўкі нядаўна ўпершыню сталі матулямі. Святлана пры кожнай размове скардзіцца, што яе шасцімесячная дачушка ну ніяк не хоча спаць: падрэмле хвілін пятнаццаць — і ўсё на гэтым. Дзяўчынка згодная праводзіць час пераважна ў бацькоўскім ложку, толькі яе мама, якая супраць сумеснага сну, цярпліва перакладвае малую ў яе ўтульны ложачак з надзеяй, што тая нарэшце яго палюбіць. Кацярына, якая нарадзіла свайго сыночка ўсяго некалькі тыдняў таму, прызнаецца, што маленькі Ільюша лепш спіць разам з бацькамі. На вялікай канапе месца, маўляў, усім хапае, навошта тады мучыць і сябе, і дзіця?!*

*Праблема дзіцячага сну — пытанне нумар адзін у «мамчыных» чатах. Шчыра прызнацца, калі нарадзіўся Цёмік, я сама была там частай госцяй. Чытала парады «бывалых» матуль, глядзела відэаўрокі кансультантаў па дзіцячым сне, нешта брала, як кажуць, на заметку і апрабоўвала на сваім сыне. Толькі карысці ад гэтага было мала: Арцёмка, як і раней, часта прачынаўся. Не паспею яго пакласці, як зноў трэба пачынаць спачатку. А немаўлятка мала пагладзіць па галоўцы і сказаць яму пяшчотнае слоўка — у такім узросце падрыхтоўка да сну ператвараецца ў цэлы рытуал! У рэдкіх хвілінах цішыні толькі і паспявала, што гарбаты папіць ці душ прыняць. Днём дык гэта паўбяды: жывём мы з бацькамі, таму з хатнімі клопатамі было каму дапамагчы. А вось ноччу, шчыра скажу, забегалася.*

*Чаму не спіць? Можа, холадна? Горача? Хоча есці? Трэба памяняць памперс? Зубы рэжуцца? Дзіця расце — і прычын для неспакойнага сну становіцца ўсё больш. І калі за ноч даводзілася ўставаць разоў гэтак восем-дзесяць, ужо ўсе сродкі былі добрыя. І дзясны мазала (у аптэках на выпадак прарэзвання зубоў усяго хапае), і да пустышкі прывучыла, і накрывала па-асабліваму, як малы любіць (каб коўдра дакраналася да носіка). А падчас зусім неспакойных начэй, калі ў нашым пакоі збіраліся ўсе, з кім дзелім жылплошчу, нават звярталася да бабуліных спосабаў — варажыла.*

*Усё аказалася значна прасцей. У адзін момант... проста забрала Цёміка да сябе ў ложак. Не магу сказаць, што ён стаў спаць да самай раніцы, але начныя пад'ёмы значна скараціліся: як і многім немаўлятам, спаць з мамай малому было і спакайней, і цяплей.*

*Праўда, знайшоўся сярод добразычліўцаў і той, хто сказаў: «Будзе сын з табой так спаць да арміі». Маўляў, я, малая, без мамы нідзе не заставалася начаваць. Сапраўды, было такое. Гуляем у бабулі, стрыечная сястра ўгаворвае, каб я паначавала. Я, вядома, пагаджаюся (нам жа так хороша разам!), але з наступленнем цемры ўсе дамоўленасці абнуляюцца: я енчу на ўсю хату, каб мяне везлі да мамы. Не зусім малая ўжо была, гадкоў шэсць-сем! І вязуць мяне дамоў альбо бацька на ровары мяне забірае (дзякуй богу, што ад нашай хаты да бабулінай — усяго нейкія тры кіламетры!).*

*Не памятаю, да якога ўзросту я спала з мамай, але дакладна ведаю, што асобны ложак і адразу ўласны пакой займела, калі мой старэйшы брат пайшоў у армію. На шчасце, Цёмік адасобіўся значна раней — дзякуй каранавірусу. Увесну ў бацькоўскую трохпакаёвую кватэру адначасова засялі на двухтыднёвы каранцін і муж, і брат, таму Цёмік вымушаны быў «перадыслакавацца» на сваё спальнае месца. І трэба сказаць, яму спадабалася. Цяпер нават проста паляжаць са мной рэдка пагаджаецца.*

*Адным словам, кожная канкрэтная сям'я вырашае сама, як ёй зручна. Некаторыя згодныя ўставаць па некалькі разоў за ноч, каб чарговы раз загушкаць сваё малое, іншыя выбіраюць больш-менш паўнавартасны сон. Як кажа вядомы дзіцячы ўрач Яўген Камароўскі, галоўнае, каб гэта задавальняла тату...*

**Вераніка КАНЮТА.**

Тыя, хто побач

Ірына ВІДАВА:

# «Такіх мужчын, як Алег Молчан, адзін на мільён»

## Чвэрць стагоддзя разам, і ніколі не было сумна ці нецікава адно з адным



12 кастрычніка 2006 года, у дзень афіцыйнай рэгістрацыі шлюбу.

**«Сакрэт шчасця» — так называўся юбілейны канцэрт спявачкі Ірыны Відавай. Гэта не проста прыгожая назва. Яна сапраўды сьвяцілася ад шчасця ўсе 26 гадоў сумеснага жыцця з кампазітарам Алегам Молчанам. А калі ён захварэў, не адыходзіла ад мужа ні на крок. Ірына Відава-Молчан расказала пра тое, што цяпер дапамагае ёй жыць.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Круглы стол

# СЯМ'Я — ТОЕ МЕСЦА, КУДЫ ЧАЛАВЕК ВЯРТАЕЦЦА ЗНОЎ І ЗНОЎ

### У грамадстве неабходна ўкараняць духоўнасць і традыцыі

**На мінулым тыдні ў храме-помніку ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню Айчыны нашай прайшоў адкрыты круглы стол Беларускага саюза жанчын з цыкла «За Беларусь» па тэме «Моцная сям'я — моцная дзяржава». У мерапрыемстве ўдзельнічалі кіраўнікі і прадстаўнікі міністэрстваў, ведамстваў, грамадскіх аб'яднанняў з розных рэгіёнаў. У фармаце адкрытага мікрафона абмяркоўвалі сямейную палітыку Беларусі, прыярытэты заканадаўчага забеспячэння інстытута сям'і, а таксама духоўныя традыцыі.**

**Намеснік міністра аховы здароўя, старшыня Беларускага саюза жанчын Алена БОГДАН:**

— Мне падабаецца слова «кансалідацыя», «з'яднанне». У гэтым ключы і пачнём цыкл круглых сталоў Беларускага саюза жанчын, грамадскіх і няўрадавых арганізацый і грамадства пра каштоўнасць сям'і, дыялогаў аб нашай духоўнай спадчыне. Сімвалічна, што круглы стол пачаўся з наведвання крыпты памяці храма Усіх Святых. Гэта тое, што абавязаны ведаць і шанаваць нашы дзеці. Падобныя каштоўнасці павінны прывівацца ў сем'ях. Спадзяюся, мы яшчэ збяромся ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны і зможам не столькі абмеркаваць пытанні глабальных змяненняў у жыцці краіны, колькі данесці да грамадства тое станоўчае, што зроблена ў Беларусі.

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ:**

— Моцная сям'я — сур'ёзная інвестыцыя ў будучыню краіны. Дзяржавай зроблена многае, каб падтрымаць сям'ю, але нельга заспакойвацца. Сёння мы ставім задачу падняць ролю бацькі ў сям'і. Нашы мужчыны, таты разумеюць, што іх роля не толькі сфарміраваць матэрыяльную забяспечанасць, але і даць любоў, увагу, клопат жонцы і абавязкова дзецям.

Лічу вельмі важнай інфармацыйную, прапагандысцкую работу па растлумачэнні каштоўнасці сям'і, ролі маці ў сям'і. Бачу, што ў разуменні гэтага ёсць сёння некаторыя праблемы: выклікаюць здзіўленне апошнія падзеі, калі асобныя маці выводзяць сваіх дзяцей на плошчу падчас масавых мерапрыемстваў. Жанчыны якраз тыя, хто павінен несці мір, любоў і дабрыню.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# СЯМ'Я — ТОЕ МЕСЦА, КУДЫ ЧАЛАВЕК ВЯРТАЕЦЦА ЗНОЎ І ЗНОЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**Начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА:**

— Сапраўды, вельмі важна павышаць прэстыж бацькоўства. Беларускія таты становяцца ўсё больш прасунутымі ў выхаванні і развіцці дзяцей. Апошнія даследаванні Белстата паказалі, што таты нароўні з мамамі ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы дзяцей да школы, баўленні вольнага часу. Мы падтрымліваем такія настроі шляхам развіцця грамадскіх ініцыятыў, розных асветніцкіх, навучальных праграм для бацькоў. Сёння ўся сістэма, якая выбудавана ў інтарэсах сем'яў з дзецьмі — нацыянальны здабытак дзяржавы. Але мы разумеем, што ніякія сацыяльна-эканамічныя меры не дадуць эфекту, калі не будзем думаць пра ўмацаванне інстытута сям'і, калі ў грамадстве не будзе мяняцца стаўленне да сям'і, сямейных каштоўнасцяў. Вядома, тут асаблівую ролю адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі. У сувязі з гэтым у праграму «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на наступны перыяд закладзена значная колькасць мерапрыемстваў па развіцці інфармацыйнай прасторы ў гэтым кірунку. Гаворка ідзе аб павышэнні ў грамадстве прэстыжу сямейнага ладу жыцця, сем'яў з некалькімі дзецьмі. Аб развіцці краіны мяркуюць па становішчы сям'і і стаўленні да яе дзяржавы. У Беларусі сёння, у адрозненне ад многіх іншых краін, увесь перыяд водпуску па доглядзе за дзіцем да 3 гадоў аплачваецца. На заканадаўчым узроўні дадзена права самой сям'і вызначаць, хто будзе знаходзіцца ў такім водпуску. Гэта права можа быць выкарыстана не толькі мамай, але і бацькам, бабуляй, дзядулем. Больш за тое, заахвочваецца роўнасць бацькоў у выхаванні дзяцей. Прычым на бацьку, калі ён знаходзіцца ў адпачынку, распаўсюджваюцца тыя ж гарантыі і льготы, што і на маці.



Сістэма дзяржаўных дапамог уключае 11 выплат, і іх памер істотны.

**Доктар гістарычных навук, прафесар кафедры сацыяльнай камунікацыі факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ірына КАЛАЧОВА:**

— Нягледзячы на тое што дзяржавай зроблена нямала для падтрымкі сям'і, мы назіраем за тым, што адбываецца ў краіне, з вялікай трывогай. Як старэйшае пакаленне, адчуваем велізарную недапрацоўку стасункаў з моладдзю. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі апярэдзілі нас, жывых носьбітаў ведаў, майстэрства, вопыту, і ў гэтым ёсць наш болевы пункт. Сям'я — гэта апора і база, тое месца, куды чалавек вяртаецца зноў і зноў. Таму і прыярытэты павінны быць вызначаны ў нашай краіне адпаведныя. Мы сёння шмат гаворым пра тое, што зрабілі для ўмацавання інстытута сям'і і яе каштоўнасцяў. Гэта ўсё правільна. Але ж трэба мець нейкую больш дакладную стратэгію. Якія пасылы сёння ў інфармацыйнай прасторы? Гэта шматдзетныя сем'і. Я кожны дзень сустракаюся са студэнтамі і разумею, што гэты пасыл ім не падабаецца. Ім не хочацца мець шмат дзяцей і заводзіць сур'ёзныя адносіны, я ўжо не кажу пра заключэнні шлюбу. Моладзь нацэлена на атрыманне адукацыі і пошук свайго месца ў свеце. Але наша задача прыдумаць, што мы можам даць маладым такое, каб яны засталіся тут, у краіне, хацелі ў Беларусі развівацца, ствараць сем'і і нараджаць дзяцей, каб палюбілі сваю радзіму. Сёння кіраўніцка-адміністрацыйныя рэсурсы, эканамічная, псіхалагічная і сацыяльная падтрымка дзяржавы павінны быць накіраваны на шырокую праслойку мэтавых груп жыхароў нашай краіны. Аналіз работы з сям'ёй паказвае, што прыярытэт дзяржавы і дзяржаўных рэсурсаў сканцэнтраваны на сем'ях, якія знаходзяцца ў зоне рызыкі, зоне асацыяльных праяў. Але ж калі добрая сям'я распадаецца, і мама адна гадуе дзіця — гэта ж таксама зона рызыкі. Таму варта сфакусавацца на дапамозе нармальным і добрым сем'ям. Я маю на ўвазе маладыя сем'і на этапе фарміравання сямейнай ідэнтычнасці, на этапе нараджэння першага дзіцяці і наступных дзяцей, на этапе сталення дзяцей і пакідання імі бацькоўскага дому і на этапе жыцця пажылой сямейнай пары. У такіх сем'ях ёсць унутраны рэсурс для засваення аказваемай ім дапамогі і стварэння грамадска карыснага прадукту — а менавіта выхавання адукаваных людзей з высокім узроўнем здароўя. Гэта ўнясе істотны ўклад у грамадскае развіццё і развіццё нашай дзяржавы.

**Настаяцель Усіхсвяцкага прыхода Мінска протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ:**

— Вянцом прыроды робіць нас не фізіялогія, якая вяртаецца ў зямлю, а дух, які па прыродзе адзіны з духам Бога. Наяўнасць гэтага духу ў чалавеку дае яму годнасць і фарміруе асобу. Чалавек закліканы ствараць, а не руйнаваць. Таму нам яшчэ нашы продкі заўсёды казалі пра тое, што важна ўмець захаваць сям'ю — і не толькі таму, што гэта напісана ў Евангеллі, але таму, што яны ўмелі шанаваць цэласнасць, і цэлае ў іх было заўсёды ў прыярытэце над прыватным. Яны разумелі, што для таго, каб жыццё на зямлі працягвалася, трэба захоўваць матрыцу, сістэму. Гэта робіць і прырода, і калі мы парушаем яе раўнавагу, то здараецца катаклізм. Сям'я — гэта таксама матрыца, якая дае базу для развіцця індывідуальнасці. Сем'і забяспечваюць наша грамадства індывідуальнасцямі ў сілу непаўторнасці кожнага роду. Неабходнай чысціні, вернасці, захаванню сямейнай сістэмы і яе каштоўнасцяў вучыць сям'я. І калі яна гэтага не дала, то разумення прыярытэту цэлага над прыватным чалавек не ўсведамляе і ніколі не будзе ведаць, навошта яму дзяржава — ён проста не здолее любіць радзіму. Сёння мы назіраем трагедыю разводаў і сацыяльнага сіроцтва ў нашай дзяржаве, якая набыла нацыянальныя маштабы. Забараняць разводы і аборты неэфектыўна. Значна больш эфектыўна вучыць людзей захоўваць чысціню і вернасць. Але як гэта зрабіць? Трэба вярнуць духоўнасць у выхаванне дзяцей, гэта лягчэй чым выпраўляць плады амаральнасці. Школа ўжо даўно не выхоўвае, а толькі аказвае адукацыйныя паслугі. Бачу выйсце ў прывіванні каштоўнасцяў і традыцый людзям з дзяцінства. Наша нацыя заснавана на хрысціянскіх каштоўнасцях, любові адно да аднаго, міласэрнасці, павазе да старэйшых, дапамозе маладым, працы і самадысцыпліне. Таму без залішняй талерантнасці трэба вярнуць у школы вывучэнне Евангелля — як кнігі маральных асноў продкаў. Тады ў нашага народа будзе правільнае разуменне хрысціянскага жыцця, будуць правільна расстаўлены прыярытэты.



**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

Бацькам на заметку

# Як з «калякі-малякі» выгадаваць «каліграфіста»

## Каб прыгожа пісаць ручкай, трэба правільна есці лыжкай

**Незлічоныя пропісі і размалёўкі, якія прадаюцца ледзьве не на кожным рагу і заклікаnы дапамагчы дашкольніку падрыхтаваць руку да пісьма, справа, безумоўна, добрая. Але ж адных толькі дапаможнікаў недастаткова, каб дзіця навучылася прыгожа пісаць. Малыя цудоўна абводзяць элементы літар па пунктыры, аднак уласныя «палачкі» і «кручочкі» атрымліваюцца надзвычай няроўныя, з няправільным нахілам, рознай вышыні і шырыні. Чаму так адбываецца, і што рабіць, раіць Таццяна КУЛАШЧЫК, настаўнік-дэфектолаг Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі.**



Няправільная пастаноўка рукі, або «курыная лапа».



Правільная пастаноўка кісці.

Перш за ўсё, трэба звярнуць увагу на тое, як малы трымае ручку. Часта дзеці захопліваюць яе чатырма пальцамі — гэткай «курынай лапай». Калі малыя загінаюць кісць рукі ўнутр, гэта не толькі абцяжарвае сам працэс напісання, але і робіць літары або роўнымі, або з нахілам у адваротны бок. Нагадаю, што правільна напісаныя літары злёгку нахіляюцца да правага верхняга куточка радка. Рука, якая «вісіць у паветры» замест таго, каб ляжаць на стале, таксама хутка стамляецца і піша непрыгожыя літары. Калі вы бачыце ў свайго малога ўсе гэтыя памылкі, то колькі б ён ні выводзіў пропісі, каліграфічныя ўменні ў яго значна не палепшацца.

Пачынаць рыхтаваць руку да пісьма трэба не з пропісаў у чатыры-пяць гадоў, а значна раней, і з... лыжкі. Так, карані праблемы пачынаюць прарастаць з моманту, калі дзіця толькі вучыцца трымаць сталовыя прыборы, яшчэ да года. І першы важны крок: навучыць дзіця ўтрымліваць лыжку правільна. Калі малы да трох гадоў утрымлівае лыжку ў кулаку, — гэта першы крок да прапедэўтычных мерапрыемстваў.

Прапедэўтыка ў адукацыі — уводны курс, які дазваляе коратка азнаёміцца з асноўнымі паняццямі, прынцыпамі і падыходамі, якія ў далейшым будуць засвойвацца больш глыбока і сістэматычна. Так і тут. Неабходна прывучаць дзіця захопліваць, набіраць кашу, суп і, не разліўшы іх, даносіць да рота. Далей па праграме дзіцячага садка малых вучаць карыстацца відэльцам і нават нажом. Гэта садзейнічае ўсведамленню розных відаў захопу, развівае зрокавую маторыку і зрокава-маторную каардынацыю.

Другі крок: умець правільна размалёўваць прадметы. Падчас выканання заданняў па мастацкай дзейнасці важна, каб рука малога правільна ўтрымлівала фламастар, аловак, крэйду і ляжала на лісце паперы, а не «вісела ў паветры». Самым маленькім можна прапанаваць маляваць «клубочкі» і «траўку», праводзіць прамыя і косыя лініі, якія аб'ядноўваюць прадметы на розных адлегласцях.

Важна вучыць дзіця ўтрымліваць кісць рукі прама і выконваць ім гэткія «косыя махі». Падчас замалёўвання дзіця наносіць кароткія і доўгія лініі. Кароткімі яно запаўняе прастору па контуры выявы, доўгімі — астатняе поле ў яе сярэдзіне. Нахіл гэтых ліній (і доўгіх, і кароткіх) павінен быць аднолькавы, крыху наўскасяк, адрозніваецца толькі іх даўжыня. Менавіта такія лініі і стануць правобразамі вялікіх і маленькіх літар.

Навучыце свайго дашкольніка правільна трымаць ручку і размалёўваць прадметы, а таксама сачыце, каб рука ляжала на стале і не загіналася ўнутр. І тады ў школе ў вас будзе вучыцца не «каляка-маляка», а маленькі «каліграфіст», пачыркам якога ўсе будуць захапляцца.

**Запісала Ірына СІДАРОК.**

# «Такіх мужчын, як Алег Молчан, адзін на мільён»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Раскажыце, як вы пазнаёміліся з Алегам?***

— Я вучылася ў Беларускім дзяржаўным педуніверсітэце на музычна-педагагічным факультэце і пачынала сама складаць песні, спяваць. Патрэбна была аранжыроўка для песні. Пыталася ў знаёмых, да каго можна звярнуцца. Мне кажуць, маўляў, у «Песнярах» ёсць Алег Молчан. Шчыра, я здзівілася. «Песняроў» лічыла небажыхарамі, і сітуацыя, што музыкант такога ансамбля выконвае замовы маладых артыстаў, здавалася па меншай меры дзіўнай. Я прыйшла, мы пагаварылі. Алег ужо тады пакарыў мяне сваім абаяннем, усмешкай. Ён вырашыў паказаць мне свае творы і ўключыў запіс песні «Маргарыта». Вось тут я закахалася ў яго і як у музыканта.

***— Гэта легенда або праўда, што з дня знаёмства вы не расставаліся?***

— Праўда.

***— Як бацькі ўспрынялі вашы адносіны?***

— Добра. Яны адразу адчулі, што Алег вельмі надзейны чалавек. І не памыліліся.

***— Алег Молчан не адразу пачаў пісаць для вас песні. Не было крыўдна?***

— Канешне, не. Тое, што мы з Алегам адразу сышліся, гэта былі, перш за ўсё, адносіны мужчыны і жанчыны. І мяне гэта задавальняла, таму што такіх мужчын адзін на мільён. Песні я і сама тады пісала. Кожны з нас быў самадастатковы як творчы чалавек, таму нам і было цікава разам. Але калі Алег падарыў мне першую песню, я ў той жа момант адмовілася ад сваіх кампазітарскіх амбіцый, таму што песні Алега лепшыя. Алег заўсёды ведаў сабе цану і перш чым пачаць пісаць для мяне, прыглядаўся, наколькі я сур'ёзны чалавек, для мяне творчасць — лад жыцця ці так, забаўка. У выніку ў нас атрымаўся выдатны тандэм — Алег пісаў музыку, я — словы да многіх нашых песень.

***— У 90-я гады вы выступалі не толькі на канцэртных пляцоўках, але і ў начных клубах Масквы і Мінска. Норавы там былі яшчэ тыя. Не баяліся?***

— Ніякіх эксцэсаў, на шчасце, не прыгадаю. Напэўна, таму што Алег заўсёды прысутнічаў на маіх выступленнях. У гэтым ён увесь — заўсёды клапаціўся пра сваіх блізкіх. Нават калі захварэў, задоўга да сакраментальнай фразы прафесара: «Прыводзьце ў парадак свае справы», Алег паклапаціўся аб маёй будучыні, перадаўшы аўтарскія правы на ўсе свае творы.

***— Часам вас называюць спявачкай Ірынай Відавай, часам — жонкай Молчана, а бывала і так, што «Алег Молчан — яе муж». А вам як больш падабаецца? І хто быў галоўны ў сям'і?***

— Усё мае права на жыццё. Я ганарылася, калі мяне называлі яго жонкай, Алег ганарыўся, калі яго называлі маім мужам. Мне спадабалася, як вы, яшчэ не ведаючы, што ў мяне падвойнае прозвішча, файлы з нашымі агульнымі з Алегам інтэрв'ю падпісвалі «Молчаны». Так больш ніхто нас не называў. Думаю, галоўнага ў сям'і ў нас не было. Мы ўсё разам вырашалі, нават дыхалі ва ўнісон. Кажуць, нельга раствaрацца ў іншым чалавеку, ні да чаго добрага гэта не прывядзе. Напэўна, гэта праўда, калі раствараецца толькі хтосьці адзін. А мне здаецца, мы не проста раствaрыліся адно ў адным, мы сталі адным цэлым. У нас на ўсё супадалі погляды, нам падабалася адно і тое ж. Пры гэтым нам ніколі не было сумна і тым больш нецікава адно з адным.

***— Уласна, таму зараз вы і працягваеце тое, што рабіў Алег у галіне абароны аўтарскіх правоў, і з'яўляецеся выконваючай абавязкі старшыні Аўтарскага савета НЦІУ і членам прэзідыума Еўразійскай канфедэрацыі таварыстваў праваўладальнікаў (ЕАКТП)?***

— Для многіх гэта быў сюрпрыз. Некаторыя людзі чамусьці думалі, што я з Молчанам проста так, для прыгажосці. На самай справе, мы ўсё абмяркоўвалі, я дапамагала Алегу. Неяк адразу так атрымалася, што на міжнародных канферэнцыях па аўтарскім праве мы выступалі кожны са сваёй тэмай і там мяне сапраўды ніхто не ўспрымаў як жонку, якая прыехала за кампанію з мужам. Алег зрабіў вельмі шмат для абароны аўтарскіх правоў кампазітараў, і я не хачу, каб уся гэтая тытанічная праца знікла з яго адыходам з жыцця, таму працягваю яго справу.



2019 год.

***— Калісьці Алег казаў мне, што цяжка знайсці жанчыну, гатовую на тое, каб частку зробленых грошай інвеставаць у творчасць, а вы пагадзіліся.***

— Таму што я — артыстка і выдатна разумею, якія ў мяне выдаткі. Мы ў чымсьці, і часам нават шмат у чым, сабе адмаўлялі, усе грошы ўкладвалі ў творчасць. З часам у нас з'явілася свая студыя, спачатку прасцейшая, а потым абсталяваная па апошнім слове тэхнікі.

***— Ірына, а як вы спраўляліся з бытавымі клопатамі? Чула, быццам бы Алег быў вельмі пераборлівы ў ежы.***

— Неяк лёгка ў нас атрымлівалася. А што датычыцца ежы, то, па-першае, ён любіў добрую кухню, па-другое, для яго была важная эстэтыка. Незадоўга да яго сыходу я зразумела, у чым справа. Аказваецца, па лініі бацькі яго прадзед — граф. А даведалася мы пра гэта ад сваячкі Алега, якая працуе ў РНПЦ анкалогіі і радыяцыйнай медыцыны імя Аляксандрава. Яна знайшла ў сямейным архіве старыя дакументы.

***— Не раз чула, як музыканты казалі, што «Молчан умее знайсці грошы». І нават зайздрослівую фразу: «Молчан — вельмі багаты чалавек».***

— Алег умеў зарабляць. Умеў знаходзіць партнёраў для правядзення канцэртаў. Але калі ў 90-я бізнесмены лёгка зараблялі і некаторыя лёгка расставаліся з грашыма, то ўжо даўно ўсё не так. «Вельмі багаты» — гэта гледзячы з кім і з чым параўноўваць. Наша сям'я добра забяспечаная, у тым ліку таму, што мы абодва працавалі. І ведаеце, Алег заўсёды з задавальненнем траціў грошы, не быў прагным чалавекам. Адносна фінансаў у нас такая філасофія: чым лягчэй выдаткоўваеш, тым больш зарабляеш.

***— Упершыню анкапацыентам Алег стаў у 2009 годзе. Як вы рэагавалі на дыягназ?***

— Мы не вельмі разумелі, наколькі ўсё гэта сур'ёзна, таму што ніхто даступна не растлумачыў, як гэта небяспечна. Больш за тое, у 2012 годзе Алега знялі з уліку. Праз чатыры гады хвароба вярнулася, амаль тры гады Алег змог пратрымацца дзякуючы таргетным прэпаратам. Молчан вельмі дзейны чалавек, ён актыўна і дысцыплінавана лячыўся, не ўпаў у роспач. Прызнаюся, што і горшыя сцэнарыі мы абмяркоўвалі, але не хацелі ў іх верыць. Менавіта за гэтыя, як аказалася, апошнія гады ён правёў свае аўтарскія канцэрты, напісаў цудоўныя песні.

Нават вясной мінулага года, калі хвароба ўчапілася ў яго мёртвай хваткай, ён не здаваўся.

***— Апошнія пяць месяцаў жыцця мужа вы былі з ім неадлучна. Палата ў Бараўлянах стала вашым вымушаным домам, які Алег называў жартам піянерскім лагерам.***

— Не ўяўляю, як можна было па-іншаму. Упэўнена, калі чалавек хварэе, яму важна, каб побач былі самыя блізкія. І мне так было спакайней. За гэты час я ні разу не засталася начаваць дома, старалася не адлучацца нават па нейкіх справах.

***— Не ўсе людзі могуць прыняць такую хваробу, жыць годна, не разлзаваўшыся на ўвесь свет: чаму гэта са мной адбываецца. Алег жа проста бездакорна прайшоў гэты шлях.***

— Ён годна прайшоў усё жыццё. Гэта чалавек, які ніколі не шукаў, хто вінаваты, а рабіў сваю справу, падтрымліваў тых, хто слабейшы. У Бараўляны да нас пастаянна прыходзілі сябры, калегі. І нават знаходзячыся там, ён папросту мог удакладніць у кагосьці, ці патрэбна дапамога.

***— Як вам удалося выехаць на лячэнне ў Жэневу?***

— Гэта было няпроста, і да сённяшняга дня мне здаецца, што мы спазніліся. Людзі памыляюцца, калі думаюць: ёсць грошы, можна ехаць лячыцца за мяжу. Замежныя лекары вельмі ўважліва вывучаюць медыцынскую дакументацыю, якую ім рыхтуюць нашы спецыялісты. Усё лета мы не маглі з'ехаць менавіта таму, што замежнікі не задавальнялі вынікі абследаванняў, аналізаў. А грошы былі: усе выдаткі ўзяла на сябе ЕАКТП.

Нават калі мы прыехалі, амаль тыдзень жылі ў гатэлі, яшчэ на месцы Алега дааабследавалі. Прагноз лекараў быў 50 на 50. Яны казалі, што для свайго стану Алег трымаецца вельмі добра, адзначалі яго моцную прагу да жыцця. У медыцынскай справаздачы швейцарскі доктар падкрэсліў: «Мяне вельмі ўразіў яго добры агульны настрой, нягледзячы на доўгую гісторыю прагрэсуючай меланомы».

А 12 кастрычніка Алег кажа мне: «Ірачка, у нас жа дзень вяселля, паехалі на экскурсію». І мы здзейснілі аўтамабільнае падарожжа па Жэневе. У гэтым горадзе знаходзіцца штаб-кватэра Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці, і ў той час там ужо былі дакументы на прадстаўленне Алега да ўзнагароджання залатым медалём САІУ.

У клініцы Алег адразу ўлюбіў у сябе ўвесь персанал. Калі медыкі даведаліся, што месье Молчан — кампазітар, яны знайшлі яго музыку на YouTube. Вельмі рада, што апошнія дні Алег пражыў у такой камфортнай і прыемнай абстаноўцы. У швейцарскіх лекараў мне спадабаліся два «залатыя правілы»: пацыент не павінен адчуваць боль, родных трэба інфармаваць пра ўсё ў максімальна даступнай і далікатнай форме. Таксама доктар у той жа справаздачы адзначыў, што «лячэнне спадара Молчана, несумненна, было палегчана прысутнасцю яго жонкі, якая аказвала яму пастаянную падтрымку. Гэта было вельмі важна для яго апошніх дзён». Мне няцяжка было яго даглядаць. Хвароба ўсё роўна яго не перамагла: за дзень да смерці ён стаяў на трэнажоры, паранейшаму жартаваў, абмяркоўваў планы.

> **«Мне здаецца, мы не проста растварыліся адно ў адным, мы сталі адным цэлым. У нас на ўсё супадалі погляды, нам падабалася адно і тое ж».**

***— Ірына, як вам удалося так сябе трымаць у руках, самой арганізаваць пахаванне?***

— Разумела, што на мне вялікая адказнасць, трэба было годна яго праводзіць. Нягледзячы на тое, што ён памёр у суботу, тэлефанавала з Жэневы, і шмат пытанняў атрымалася ўладзіць дыстанцыйна. Не люблю публічных слёз. Так склалася, што мы з Алегам тры разы развітваліся: у 2009-м, 2016 годзе і незадоўга да смерці. Кожны раз ён казаў мне пра тое, што нельга ўпадаць у дэпрэсію, у слёзы. Трэба працягваць жыць і працаваць. Для мяне зараз самая важная праца — зрабіць усё для таго, каб людзі памяталі кампазітара Алега Молчана, каб гучала яго цудоўная музыка. Менавіта гэта дапамагае мне жыць, напаўняе сэнсам кожны дзень. А што датычыцца слёз, то не такая ўжо я жалезная. Вядома, плакала. Я магла выйсці на пяць хвілін з палаты, выцерці слёзы і вярнуцца з усмешкай. Ведаю, што Алегу мае слёзы не дапамаглі б, а толькі знервавалі.

***— За гэты год вам удалося зрабіць неверагодна шмат. Прайшлі два канцэрты да 55-гадовага юбілею кампазітара, створаны яго сайт. Пра апошнія падзеі раскажыце самі.***

— У мінулую нядзелю ў Белдзяржфілармоніі прайшоў канцэрт памяці Алега Молчана «Там, высока». Праграму я склала так, каб паказаць усе грані яго таленту: прагучалі не толькі любімыя песні, але і харавыя творы, фартэпіянныя п'есы. У канцэрце адбылося сем прэм'ер! Алег яшчэ ўлетку працаваў, пісаў музыку. І сёння хачу сказаць дзякуй публіцы, якая сабралася, нягледзячы ні на што, ушанавала памяць кампазітара і вельмі цёпла прымала ўсіх артыстаў.



У Жэневе на прагулцы. Кастрычнік 2019-га.

У дзень смерці Алега, 26 кастрычніка, на доме, у якім прайшлі яго дашкольныя гады, адкрылі мемарыяльную дошку. Гэта работа творчага тандэма скульптараў Вольгі Нячай і Сяргея Аганава. Яны вельмі дакладна і далікатна ўвасобілі ў бронзе вобраз Алега Молчана.

***— Чаму вы абралі дом, дзе ён нарадзіўся, а не той, дзе жыў апошнія гады?***

— Ён вельмі любіў нашу кватэру ў Пакроўскім квартале і ўвесь гэты зручны і камфортны раён. Але я абрала вуліцу Ракаўскую, таму што там фарміраваўся яго характар. Ён наогул любіў тую частку горада, дзе Ракаўская, Траецкае, плошча Свабоды. Да таго ж, гэта цяпер папулярныя турыстычныя месцы, а я хачу, каб Алега памятала як мага больш людзей.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

**Фота з асабістага архіва Ірыны ВІДАВАЙ-МОЛЧАН.**

Ёсць пытанне

# БЯЗДЗЕТНЫЯ... ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ

## Ці ва ўсім яны не маюць рацыі?

**Даслоўна англійскае слова «чайлдфры» перакладаецца як «свабодныя ад дзяцей». Так ва ўсім свеце называюць сябе людзі, якія свядома вырашылі не станавіцца бацькамі. Пазіцыя адмовы ад гэтай, здавалася б, закладзенай у кожным патрэбы выклікае хвалю асуджэння — на форумах, дзе збіраюцца чайлдфры, заўсёды можна сустрэць хейтараў, якія абвінавачваюць «свабодных ад дзяцей» у эгаізме, спажывецкім стаўленні да жыцця і наогул ва ўсіх смяротных грахах. Але чаму некаторыя людзі прыходзяць да такога рашэння? І што пра ўсё гэта думаюць псіхолагі?**

### АДКУЛЬ ЯНЫ ЎЗЯЛІСЯ

Прыхільнікі філасофіі чайлдфры — прадстаўнікі самых розных прафесій, з розным жыццёвым вопытам і ўзроўнем адукацыі. Падобныя погляды на пытанне дзетанараджэння могуць выказваць як юныя хлопцы і дзяўчаты, так і дарослыя жанчыны і мужчыны, як людзі вельмі забяспечаныя і паспяховыя, так і тыя, хто ўсё жыццё балансуе на краі фінансавай прорвы, як уладальнікі дыпломаў прэстыжных ВНУ, так і тыя, хто з цяжкасцю скончыў агульнаадукацыйную школу.

Існуе стэрэатып, што ў падобныя супольнасці ў сеціве аб'ядноўваюцца няшчасныя, адзінокія, псіхічна нездаровыя асобы, якія ненавідзяць усіх вакол.

— Перш за ўсё, далёка не ўсе чайлдфры сацыяфобы, якія праводзяць свой век у адзіноце, у пустой кватэры перад манітoрам камп'ютара. Гэта могуць быць актыўныя жыццярадасныя людзі, часта яны ўтвараюць пары і нават рэгіструюць шлюбы з тымі, хто падзяляе іх погляды, — кажа **сямейны псіхолаг Кацярына АЛЁХІНА.** — Ну, а працэнт псіхічных адхіленняў сярод тых, хто прытрымліваецца філасофіі «свабоды ад дзяцей», не вышэй і не ніжэй, чым сярод людзей, якія з'яўляюцца бацькамі.

Філасофія чайлдфры — зусім не параджэнне трэцяга тысячагоддзя, яе ўзрост — амаль сто гадоў. Больш за тое, чайлдфры — не вытворная «сытых» часоў, эпохі эгаізму і спажывецтва, тут хейтары не маюць рацыі. Усё якраз наадварот. Як пішуць сацыёлагі, што даследавалі гэтае пытанне, ідэя «свабоды ад дзяцей» упершыню сфарміравалася ў канцы саракавых гадоў багатага на ўзрушэнні мінулага стагоддзя як адказ на дзве сусветныя вайны. А набыла мноства прыхільнікаў пасля скідвання бомбаў на Хірасіму і Нагасакі. Сутнасць яе была такой: чалавечае жыццё абясцэнена, а значыць, не варта нараджаць дзяцей: усё роўна ў гэтым няма ніякага сэнсу. У краінах былога Савецкага Саюза рух чайлдфры знайшоў паслядоўнікаў пазней, у 1990-х таксама ў адказ на сацыяльныя ўзрушэнні і абясцэньванне чалавечага жыцця. Падсвядомы эмацыянальны пасыл быў амаль такі ж: «Свет — небяспечнае, варожае чалавеку месца, і прыводзіць у яго дзяцей — жорстка». Ну, а развіццё сферы кантрацэпцыі спрасціла ўвасабленне ідэі ў жыццё.

У нашы дні, перш чым задумвацца пра нашчадкаў, адказныя маладыя людзі часта імкнуцца дамагчыся пэўнага матэрыяльнага становішча, «устаць на ногі», каб мець магчымасць даць свайму дзіцяці годныя ўмовы жыцця. Атрымліваецца гэта далёка не ва ўсіх, але ў любым выпадку спроба «падняцца наверх» патрабуе часу і намаганняў. Узрост дзетанараджэння ў жанчын абмежаваны, і калі ён мінуў, застаецца невялікая колькасць варыянтаў: экстракарпаральнае апладненне (дарагое і не заўсёды дае вынік), усынаўленне (да якога гатовая не кожная) і тая самая філасофія чайлдфры як спосаб прыняць тое, што немагчыма змяніць.

Яшчэ адна глабальная перадумова — свабода выбару, якая ёсць у сучаснай жанчыны ў большасці краін свету. Шляхі і спосабы самарэалізацыі ў кожнай канкрэтнай прадстаўніцы прыгожага полу могуць значна адрозніваца ад традыцыйных «добрая маці» і «выдатная гаспадыня» — магчыма, з прычыны асаблівасцяў яе характару ёй проста патрэбны «іншы п'едэстал гонару». І гэта яе права, тым больш што грамадства ў наш час без агрэсіі або зневажальнага жалю ставіцца да жанчын, якія па тых ці іншых прычынах не сталі маці.

### ШТО КАЖУЦЬ ПСІХОЛАГІ

На пытанне «Яны наогул нармальныя?» псіхолагі адказваюць: так, такое перакананне можа быць варыянтам нормы. Але толькі ў тым выпадку, калі на ўсіх трох узроўнях — розуму, эмоцый і паводзін — гэтая тэма для жанчыны не з'яўляецца «пунктам», да якога яна вяртаецца зноў і зноў. Калі гэта варыянт нормы, жанчына здольная лагічна растлумачыць сваё рашэнне. У яе няма перажыванняў, праяў агрэсіі, негатыўных эмоцый, калі яна чуе пытанне: «Ці ёсць у вас дзеці?» Або: «Чаму ў вас да гэтага часу няма дзяцей?» Яе не раздражняюць цяжарныя і мамы з каляскамі. Яна зрабіла свой выбар.



Дарэчы, у тых, чый выбар усвядомлены, часцей за ўсё няма неабходнасці хадзіць на форумы і ўступаць у супольнасці чайлдфры.

— Наадварот, удзел у такіх групах можа стаць вырашэннем неўсвядомленай, падаўленай агрэсіі. Калі чалавек не цалкам упэўнены ў правільнасці свайго выбару, ён мае патрэбу ў пацвярджэнні: «Гэтак жа, як я, думаюць і іншыя, мае ідэі падзяляе мноства людзей». Часам агрэсіўнае нежаданне станавіцца маці, напрыклад, можа мець у аснове моцнае жаданне нарадзіць дзіця, якое ніяк не можа ўвасобіцца ў жыццё, — кажа спецыяліст. — Прычынай могуць быць няўдачы ў выстройванні адносін з процілеглым полам, праблемы са здароўем (вельмі часта ў маладых дзяўчат) страх не справіцца, не забяспечыць дзіця ў сілу недастатковасці фінансавых рэсурсаў. Дарэчы, нярэдка бывае, што васемнаццацігадовыя чайлдфры ў трыццаць становяцца клапатлівымі мамамі і татамі, што вельмі любяць сваё дзіця.



Але вернемся да прычын выбару «свабоды ад дзяцей». Іх мноства, адзначаюць спецыялісты. Напрыклад, так званая «бікар'ерная сям'я», дзе і муж, і жонка нацэлены ў першую чаргу на рашэнне прафесійных і кар'ерных задач. Або дзіцячы вопыт дзяўчат, якія выраслі ў дэструктыўных сем'ях з эмацыянальна непрымальнымі адносінамі паміж бацькамі і дзецьмі. Гэта можа быць няпоўная бацькоўская сям'я, дзе мама «паклала жыццё» на тое, каб вырасціць дзяцей. Або занадта строгае выхаванне з мноствам забарон. Ці адсутнасць даверлівых адносін з мамай. Усё гэта становіцца тымі фактарамі, якія падштурхоўваюць жанчыну да рашэння не мець уласных дзяцей. «Маё дзяцінства не было шчаслівае, і я не хачу вяртацца да яго нават у іншай ролі, у ролі маці» — так можна вызначыць установку, якую фармулюе жанчына ў гэтых выпадках.

Што датычыцца мужчын, якія вырашылі не мець дзяцей, псіхолагі кажуць пра «сіндром старэйшых сыноў». Гэта адбываецца, калі з нараджэннем малодшых старэйшаму адмаўляюць у праве быць дзіцем: «Ты ўжо вялікі», «Ты старэйшы, ты павінен глядзець за малодшымі, дапамагаць ім, абараняць іх», «Ты будзеш дзяліцца з імі цацкамі і прысмакамі» і г. д. У гэтым выпадку будучы мужчына фармулюе ўстаноўку: «Малодшыя ў сям'і — гэта тыя, з кім прыйдзецца дзяліцца сваёй унікальнасцю». І ён вырашае не мець дзяцей, каб атрымаць ад жыцця тое, што не атрымаў у дзяцінстве. Часта такія мужчыны наогул не здольныя да доўгачасовых адносін і ўсё жыццё пазбягаюць шлюбу.

Калі ж казаць пра несвядомыя ўстаноўкі, то тут псіхолагі шукаюць адказ у самай ранняй гісторыі чалавека, які вырашыў адмовіцца ад мацярынства або бацькоўства. Шматлікія даследаванні пацвярджаюць, што на стаўленне да ўласнага мацярынства (або бацькоўства) уплывае стаўленне маці да дзіцяці яшчэ на этапе ўнутрывантробнага развіцця. Калі цяжарнасць была нежаданая або мела скажоныя матывы («атрымалася выпадкова», спосаб утрымаць каханага, біялагічны гадзіннік, «нараджай, а то развядзёмся»), то праз шмат гадоў на падсвядомым узроўні гэта можа паспрыяць выбару філасофіі «свабоды ад дзяцей» ужо дарослага сына або дачкі.

### СЛОВА МАМАМ

Аліна нядаўна нарадзіла трэцяе дзіця, а яе старэйшая сястра Анастасія дзяцей не мае і мець не плануе.

— Насця з пяшчотай ставіцца да пляменнікаў і яны шчыра любяць сваю цётачку, — кажа Аліна. — Але ў сястры зусім іншы склад характару, яна фатограф, працуе на крутую кампанію, пастаянна падарожнічае па свеце і наўрад ці здольная праседзець дома больш за тыдзень. Неяк я пакінула з ёй маіх маленькіх сыноў на дзве гадзіны, і, калі прыйшла, зразумела, што ёй было неверагодна цяжка з імі без мяне. Насця не створана быць маці, але ад гэтага яна не становіцца дрэнным чалавекам. Тым больш што я згодная з ёй па многіх пытаннях, якія мы часам абмяркоўваем, разважаючы пра мацярынства. Я таксама лічу, што нараджаць дзяцей, каб умацаваць сям'ю, — эгаістычна ў адносінах да дзяцей. Тым больш што дзеці не ўмацоўваюць сям'ю — гэта не больш чым стэрэатып. Сям'ю ўмацоўваюць агульныя інтарэсы, давер і ўменне слухаць і чуць адно аднаго. І ўжо сапраўды не варта нараджаць дзяцей, «каб не адчуваць сябе адзінокімі». Кіруючыся гэтым матывам, не варта заводзіць нават хатніх жывёл. Няправільных матываў мноства: «Ва ўсіх ёсць дзеці, і ў мяне таксама павінны быць», «Потым будзе позна», «Каб мама перастала пытацца, калі чакаць унукаў», «Каб павялічыць жылплошчу» і г. д. Усё гэта цягне за сабой выбудоўванне няправільных сувязяў паміж бацькамі і дзіцем. А адна з самых небяспечных, на мой погляд, установак — «Я нараджу дзіця, і яно дасягне большага, чым я». Дзіця не абавязана выконваць вашы мары і не павінна станавіцца заложнікам вашых псіхалагічных праблем.

— Навошта ж тады трэба нараджаць дзяцей?

— Я б сказала, няма чаго. Мне здаецца, правільны матыў — проста жаданне прывесці ў свет яшчэ адно жыццё. Адчуванне перапоўненасці пяшчотай і любоўю, якімі хочацца дзяліцца не толькі з мужам. Мне здаецца, усе адмоўныя ўстаноўкі пры нараджэнні дзіцяці звязаны з жаданнем нешта атрымаць. І калі бацькі гэтага не атрымліваюць ад дзяцей (а яны, хутчэй за ўсё, не атрымаюць тое, на што падсвядома разлічваюць), яны адчуваюць негатыўныя эмоцыі, расчараванне. Ім здаецца, што роднае дзіця ім здрадзіла. Аб якіх здаровых адносінах бацькоў і дзяцей можна казаць у гэтым выпадку? Правільная ўстаноўка на мацярынства або бацькоўства — гэта жаданне бескарыслівa аддаць маленькаму чалавеку свае любоў, пяшчоту і клопат. Калі гэта ёсць — у вас ёсць шанц стаць добрымі (чытай: шчаслівымі) бацькамі, а ў вашых дзяцей — вырасці ў гарманічнай сям'і, дзе яны будуць не клопатам і цяжкім крыжам, а неверагодным задавальненнем.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Гасцёўня «СГ»


Фота Таццяны РУСЕЦКАЙ.

## Юлія ЧЫНВЯОКВУ:

# «Дзецi — маё натхненне, бясконцая матывацыя i рэсурс»

**Калі бачыш гэтую жанчыну, адразу падпадаеш пад яе абаяльнасць. Прыроджаная жаноцкасць вабіць і прымушае моцны пол азірацца ўслед, а чароўныя элегантныя вобразы захапляюць і служаць для беларускіх прыгажунь своеасаблівым стымулам у рабоце над сабой.**

Сёння ў гасцях у «Сямейнай газеты» — вядомая стылістка, гісторык моды, журналістка, а таксама маці пяцярых дзяцей-мулатаў Юлія Чынвяокву.

***— Юлія, давайце пагаворым пра вашу дзейнасць, пра тое, з чаго ўсё пачалося...***

— Спачатку я працавала як стыліст, да гэтага вучылася ў Школе моды і стылю Ірыны Ільінскай, пасля ў Маі Старавойтавай у яе Fash`on school. Аднак зразумела, што для мяне гэтага яшчэ недастаткова, хацелася глыбіні. Цікавіла менавіта гісторыя моды, а гэта шырокая сфера, якую я пачала вывучаць самастойна. З цягам часу ў мяне назапасілася шмат ведаў, з'явілася жаданне дзяліцца імі. Так узнік праект «120 гадоў моды» — курс лекцый аб развіцці моды 1900—2020 гадоў (пасля, мяркую, з'явіцца і курс па больш раннім перыядзе). Для мяне вельмі важныя рэальныя адносіны, падабаецца, калі на лекцыі прыходзяць у добра падабраным вобразе, сама стараюся апранаць сукенкі і аксесуары ў стылі пэўнай эпохі. У планах — развіваць дзейнасць у консультацыйным кірунку, гэта цяпер актуальна.

***— Як думаеце, па што жанчыны прыходзяць на вашыя сустрэчы, майстар-класы?***

— Часцей за ўсё да мяне прыходзяць жанчыны, падпісаныя на мой Instagram. Яны ведаюць мяне завочна, ім падабаюцца мой стыль і філасофія прыгажосці, элегантнасць ды эстэтыка.

***— Ведаю, што вы супрацоўнічаеце з Добрушскім фарфоравым заводам. Раскажыце, калі ласка, падрабязней, у чым сутнасць вашага ўдзелу?***

— Гэта наш адзіны фарфоравы завод у Беларусі. Аднак, як ні дзіўна, многія пра гэта не ведаюць, і для мяне як для карэннай дабрушанкі такі факт сумны. Я раблю публікацыі ў акаўнтах сацыяльных сетках прадпрыемства, выкладваю фота посуду і апісанні да іх. Многія мае знаёмыя зацікавіліся беларускім брэндам, а я пачала выкарыстоўваць элегантныя чайныя пары ў якасці падарунка на сваіх сустрэчах-лекцыях.

***— Малая радзіма неяк паўплывала на ваша фарміраванне як асобы?***

— На мяне, безумоўна, вялікі ўплыў аказаў Добруш. Я вучылася ў мясцовай гімназіі, там былі выдатныя настаўнікі, з некаторымі і дагэтуль падтрымліваю сувязь, напрыклад, са сваёй настаўніцай рускай мовы і літаратуры Тамарай Пятроўнай Рабковай. Дзякуючы такім настаўнікам добра давалася вучоба, я ўдзельнічала ў рэспубліканскіх алімпіядах па беларускай мове і літаратуры, займала прызавыя месцы. Мае першыя літаратурныя вопыты былі менавіта ў Добрушы. Там я ўпершыню напісала сваю казку, адаслала яе на радыё. Памятаю, сядзела і слухала, як яе чытаюць у праграме «Калыханка»... Я ні разу не пашкадавала, што пайшла калісьці вучыцца на філфак, хоць цяпер мая дзейнасць зусім не літаратурная. Аднак у планах запусціць другі свой праект — цыкл лекцый аб сяброўстве мастакоў і пісьменнікаў.

***— Вы незвычайная мама для беларускай рэчаіснасці — у вас пяцёра дзяцей-мулатаў. Раскажыце пра іх.***

— З іх бацькам Эмануэлем я пазнаёмілася ва ўніверсітэце, ён таксама вучыўся на філфаку, сам з Нігерыі. Кожная цяжарнасць была нечаканая, але мы ніколі не былі супраць, радаваліся новаму чалавеку, які прыйдзе ў гэты свет. Хлопчыкі Габрыэль, Даніэль і Рафаэль займаюцца футболам у ФК «Мінск». Дачушцы Мішэль падабаецца танцаваць і спяваць, таму зараз мы ў пошуках школы, бо лічу, калі дзіця нечым цікавіца, трэба дазволіць яму спрабаваць сябе ў гэтым. Малодшую Ізабэль у гэты момант пакінула на старэйшага сына, які прыйшоў са школы. Увогуле, я вельмі ўдзячная сваім дзецям, што ўжо магу на іх разлічваць. А яшчэ дзеці — маё натхненне, бясконцая матывацыя і рэсурс.

***— Не баяліся асуджэння, непаразумення з боку родных?***

— Спачатку асуджэнне было. Натуральна, для маленькага Добруша гэта ўвогуле быў шок. Усе адгаворвалі, але я была ўпартая. Калі з'явілася першае дзіця, мне было ўсяго 22 гады, і тады хвалявала меркаванне іншых. А потым перастала заўважаць і звяртаць увагу, хто што думае. Я разумею: гэта мае дзеці і яны назаўсёды будуць часткай мяне.

***— Як атрымліваецца ў шматдзетнай мамы знаходзіць час для сябе і сваёй справы?***

— Вядома, гэта патрабуе самаарганізацыі. Я шмат кніг прачытала па тайм-менеджменце. Хацела, каб быў нейкі баланс паміж работай і дзецьмі. Калі разумею, што адбываецца перакос у нейкі бок, то адразу пераглядаю, што дзе не так. Цяпер у мяне досыць жорсткі графік. Аднак на кнігі стараюся заўсёды знайсці гадзінку, гэта звычайна адбываецца ноччу ці раніцай, пакуль усе яшчэ спяць, бо для чытання неабходная свежая галава — для мяне важна не колькасць прачытаных старонак, а ўсвядомленасць, з занатаваннем, падкрэсліваннем, каб інфармацыю потым можна было прымяніць на сваіх лекцыях.


Фота Алены ШКАРПІТНАЙ.

***— Неяк вы напісалі: «Куды б я ні збіралася, перш-наперш кладу ў сумку кнігу». Якая кніга зараз у вашай сумцы?***

— «Гульня ў бісер» Германа Гесэ. Гэта не першая яго кніга, з якой мне давялося пазнаёміцца. Цікава, што Гесэ быў такім жа бібліяфілам, як і я, у той жа час вельмі педантычным калекцыянерам — нічога лішняга не набываў. Бяру прыклад з яго, бо мая хатняя «кнігарня» вельмі разраслася, і часта я хаджу па кнігі ў бібліятэку. Адначасова чытаю беларускую літаратуру — восенню хочацца нечага асаблівага — Караткевіч і яго «Лісце каштанаў» цудоўна падыходзіць для такой пары.

***— Ці праўда, што вы былі знаёмы з Іванам Шамякіным і дзякуючы яго пратэкцыі паступілі ва ўніверсітэт?***

— Я вучылася ў такі час, калі многія лічылі, што паступіць можна не толькі праз веды, а і за грошы альбо па блаце. За год да паступлення ў БДУ мяне як адну з найлепшых вучаніц накіравалі ў Мінск на сустрэчу, прымеркаваную да 80-годдзя Івана Шамякіна. Там я не толькі пазнаёмілася са славутым пісьменнікам, узяла ў яго аўтограф, але пабачыла і іншых, выдатных майстроў слова таго часу. Праз год я трапіла на кафедру да яго дачкі Таццяны Іванаўны Шамякінай, цесна супрацоўнічала з ёй падчас напісання курсавых, а потым і дыплома. Тады і пайшлі чуткі, што я паступіла дзякуючы знаёмству з Шамякіным. Чуць гэта было дзіўна і смешна, бо я прывыкла заўсёды спадзявацца на сябе. З іншага боку, калі пра цябе ходзяць чуткі, значыць, ты цікавы і папулярны (*смяецца*).

***— Вы неяк сказалі, што доўгі час баяліся сваіх жаданняў, не маглі даць волю амбіцыям і марам. Калі адчулі, што ўсё магчыма?***

— Я шкадую, што так шмат часу пайшло на гэта. Штуршком былі менавіта дзеці. Калі зацяжарала чацвёртым, зразумела: прыкрывацца дзецьмі больш нельга. Наша жыццё абмежавана, і няма часу адкладваць свае мары на потым. Я чакала дзяўчынку, і ў гэты перыяд у мяне абвастрылася пачуццё прыгажосці. Зразумела, што не згодная на ролю толькі хатняй гаспадыні, менавіта ў той час пачала развівацца як стыліст. Калі надышла пятая цяжарнасць, сяброўцы сказала, што, напэўна, трэба ставіць крыж на творчасці. Аднак яе словы сталі для мяне выклікам: «А ты рабі з пяццю тое, што не магла з чатырма». Таму не люблю, калі людзі апраўдваюцца дзецьмі, гэта заўсёды няшчырасць з самім сабой.

***— Напэўна, у паўсядзённым жыцці ваш унутраны крытык не дае спакою: часта звяртаеце ўвагу на тое, як чалавек апрануты, ці ўсё ў яго добра са стылем?***

— Вядома, я заўважаю хібы ў адзенні мінакоў, аднак разумею, што гэта ад няведання, і не асуджаю іх ні ў якім разе. Часта бачу жанчын, якія махнулі на сябе рукой, і вельмі сумна за іх. Разумею, што знешнасць — гэта адлюстраванне ўнутранага свету. Таму я за тое, каб працаваць з чалавекам, аднак, на жаль, я не псіхолаг.

***— Юлія, вы часта разбіраеце шкатулкі з упрыгажэннямі вашых кліентак, праводзіце рэвізію ў іх шафах. Раскажыце, якія памылкі яны дапускаюць і ад чаго часцей раіце пазбаўляцца?***

— Настойваю, каб прыносілі свае шкатулкі на нашы сустрэчы, бо ўпрыгажэнне — гэта таксама важная характарыстыка. А пазбаўляемся ад рызыя для дому ці лецішча, ад рэчаў на выпадак «калі пахудзею» — на жаль, на той момант яны будуць неактуальныя. Ёсць у мяне адна заможная кліентка, з якой вось ужо другі год разбіраем гардэроб: ён сапраўды велізарны. Шмат дарагіх рэчаў, якія шкада аддаваць ці прадаваць танна, але яны не носяцца, таму паралельна мы фарміруем актуальны гардэроб... Увогуле, раю праводзіць рэвізію гардэробу напачатку кожнага новага сезона, пазбаўляцца ад рэчаў, якія не ўпрыгожваюць і не выклікаюць станоўчых эмоцый. Трэба насіць тое, што падабаецца і што пасуе. Асабіста я не баюся нават нейкай тэатральнасці ў сваім адзенні. Магу паўтарыць які-небудзь вобраз з фільма і пры гэтым не буду адчуваць сябе некамфортна. Для мяне вельмі важная жаноцкасць, якая ідзе знутры, гэта гармонія, адсутнасць барацьбы, грубасці.

***— Складваецца ўражанне, што вы жывяце, радуючыся кожнаму дню. Але сучаснаму чалавеку цяжка спыніцца і агледзецца, убачыць прыгажосць вакол сябе...***


Фота Настассі КАЖУХОЎСКАЙ.

— Мне здаецца, для жанчыны гэта першародны рэсурс. Кожная жанчына павінна хоць бы раз на тыдзень выходзіць, выязджаць на прыроду, у лес, каб напоўніцца, адпусціць свае думкі. Бачыць прыгажосць — гэта таксама навык, які можна трэніраваць. Для гэтага трэба практыкавацца ў прыгожым, наведваць музеі, глядзець на жывапіс вялікіх майстроў, увогуле, цікавіцца мастацтвам.

***— Юлія, а пра што вы марыце?***

— Мару, каб маё імя асацыявалася ў людзей з гісторыяй моды, культурай, каб большая колькасць людзей далучалася да прыгажосці. Няправільна не дазваляць сабе таго, чаго ты хочаш. Я сама некалі гэтым грашыла. Цяпер, калі надзяваю турбан з вэлюмам і пяром, бачу, як спачатку ўсе азіраюцца, а пасля прызнаюць, што мне гэта пасуе, і яно становіцца маёй своеасаблівай «фішкай». А яшчэ мару жыць у Пецярбургу...

***— І холад вас не пужае?***

— Не. Я люблю холад, і восень мая любімая пара. Летам чакаю заўсёды восень, нават няёмка ў гэтым каму-небудзь прызнацца (*смяецца*). Гэта самы плённы час для мяне.

**Гутарыла Надзея ЗУЕВА.**

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 30.11.2020 открытого аукциона по продаже имущества

# ОАО «Трест Белсантехмонтаж № 1»

**Лот № 1:** капитальное строение с инв. № 700/С-45153 – главный корпус завода, общ. пл. 10234,6 кв. м. Капитальное строение с инв. № 700/С-109026 – канализационная сеть, протяженность – 605,5 м. Капитальное строение с инв. № 700/С-109027 – сети водопровода, протяженность – 1381,9. Капитальное строение с инв. № 700/С-109029 – ливневая канализация, протяженность – 658,5 м. Капитальное строение с инв. № 700/С-90917 – площадка открытого хранения, пл. 5 561, 0 кв. м 1/3 доли капитального строения с инв. № 700/С-100287 – благоустройство территории, пл. – 4302 кв. м. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Химиков, 10, на земельном участке с кадастровым номером 740100000003006248. Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен.

***Начальная цена продажи: 2 476 040,0 0 бел. руб. с НДС.***
***Сумма задатка: 247 604,00 бел. руб.***

**Лот № 2:** изолированное помещение с инв № 700/D-106596 – изолированное помещение № 2 (склад), общ. пл. (кв. м): 11,2. Изолированное помещение с инв № 700/D-106612 – изолированное помещение № 5 (торговое помещение), общ. пл. (кв. м): 65,4. Изолированное помещение с инв № 700/D-106614 – изолированное помещение № 6 (помещение многофункциональное), общ. пл. (кв. м): 118,7. Изолированное помещение с инв № 700/D-106625 – изолированное помещение № 7 (административное помещение), общ. пл. (кв. м): 35,4. Изолированное помещение с инв № 700/D-106629 – изолированное помещение № 8 (административное помещение), общ. пл. (кв. м): 191,3. Изолированное помещение с инв № 700/D-106632 – изолированное помещение № 10 (административное помещение), общ. пл. (кв. м): 35,3. Изолированное помещение с инв № 700/D-106637 – изолированное помещение № 12 (административное помещение), общ. пл. (кв. м): 220,1. Лот № 2 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Химиков, 10-2, 10-5, 10-6, 10-7, 10-8, 10-10, 10-12.

***Начальная цена продажи: 379 680,00 бел. руб. с НДС.***
***Сумма задатка: 37 968,00 бел. руб.***

**Лот № 3:** капитальное строение с инв. № 700/С-91000 – навес склад хранения материалов, общ. пл. 87,1 кв. м, расположено по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Химиков, 10/4, на земельном участке с кадастровым номером 740100000003006248. Капитальное строение с инв. № 700/С-71891 – производственные мастерские, общ. пл. 2725,3 кв. м, расположено по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Гаражный, 9А, на земельном участке с кадастровым номером 740100000003005407. Капитальное строение с инв. № 700/С-48730 – здание проходной, общ. пл. 14 кв. м, расположено по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Гаражный, 9А, на земельном участке с кадастровым номером 740100000003000037. 1/3 доли капитального строения с инв. № 700/С-100287 – благоустройство территории, пл. – 4302 кв. м, расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000003006248. Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 3 не выделен.

***Начальная цена продажи: 668 360,00 бел. руб. с НДС.***
***Сумма задатка: 66 836,00 бел. руб.***

**Лот № 4:** капитальное строение с инв. № 700/С-91001 – склад закрытый, общ. пл. 59,3 кв. м. Капитальное строение с инв. № 700/С-48731 – здание ацителеновой станции, общ. пл. 154 кв. м. Капитальное строение с инв. № 700/С-48732 – здание гаража, общ. пл. 222 кв. м. Капитальное строение с инв. № 700/С-90918 – площадка открытого хранения материалов, пл. 6 478,0 кв. м 1/3 доли капитального строения с инв. № 700/С-100287 – благоустройство территории, пл. – 4302 кв. м. Лот № 4 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Химиков, 10, 10/3 на земельном участке с кадастровым номером 740100000003006248. Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 4 не выделен.

**Начальная цена продажи: 599 960,00 бел. руб. с НДС.**
**Сумма задатка: 59 996,00 бел. руб.**
**Обременение: запрет отчуждения по всем лотам (будет снят в случае продажи). Частичная аренда каждого из лотов**

**Аукцион состоится 30 ноября 2020 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 27.11.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by. Всю необходимую информацию можно уточнить у **Организатора аукциона:** Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С. извещает о проведении 18 ноября 2020 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 30 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

**Условие продажи:** **1.** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Земельный участок под объект продажи **(лоты № № 1, 2, 3)** будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается)

**Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Информация о земельном участке:** лот № № 1–3 расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **10,1123 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания производственных зданий завода

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14108** площадью **12 563,1 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **цех металлоконструкций.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, 8/9. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «БПС-Сбербанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 24.02.2016 № 320-00002/16-01. Договор о залоге (ипотеке) | **1 237 600,00** | 123 760,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14071** площадью **139,2 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание склада для хранения легковоспламеняющейся жидкости.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, 8 | **17 080,00** | 1 708,00 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14075** площадью **240,9 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное панельное здание компрессорной с кирпичной отапливаемой пристройкой (20 м. куб. в минуту).** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, 8 | **32 340,00** | 3 234,00 |
| 4 | Мазутохранилище (5 емкостей на 250 тонн мазута), инв. № 483 | **13 650,00** | 1 365,00 |
| 5 | Мазутохранилище (2 емкости на 100 тонн мазута), инв. № 483 | **3 360,00** | 336,00 |
| 6 | Блок контейнер (бытовка), инв. № 61392 | **2 450,000** | 245,00 |
| 7 | Барабан для сушки песка, инв. № 61038 | **1 890,00** | 189,00 |
| 8 | Лестница с площадкой для стропальщиков, инв. № 61095 | **1 610,00** | 161,00 |
| 9 | Площадка передвижная для сборки экскаватора, инв. № 61079 | **420,00** | 42,00 |
| 10 | Сварочный аппарат ВА-500 MIG/MAG, инв. № 61185 | **2 170,00** | 217,00 |
| 11 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61231 | **2 450,00** | 245,00 |
| 12 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61279 | **2 450,00** | 245,00 |
| 13 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61280 | **2 450,00** | 245,00 |
| 14 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61281 | **2 450,00** | 245,00 |
| 15 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61282 | **2 450,00** | 245,00 |
| 16 | Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61317 | **2 660,00** | 266,00 |
| 17 | Стенд для сборки бортов форм, инв. № 60984 | **5 390,00** | 539,00 |
| 18 | Стенд для сборки бортов форм ЖБИ, инв. № 60724 | **7 910,00** | 791,00 |
| 19 | Стенд для сварки балок, инв. № 61409 | **3 430,00** | 343,00 |
| 20 | Стенд для сварки балок, инв. № 61410 | **3 430,00** | 343,00 |
Тым часам днямі лідар усяпольскай нацыянальнай жаночай забастоўкі Марта Лемпарт у інтэрв'ю TVN24 заявіла: яна апасаецца, «што каго-небудзь заб'юць». На яе думку, пратэсты, якія працягваюцца, могуць прывесці да краху ўрада Матэвуша Маравецкага. Лемпарт таксама агучыла планы. Спачатку па ўсёй краіне будуць працягнутыя «стыхійныя прагулкі» па гарадскіх вуліцах, пасля — агульнанацыянальная забастоўка. На 30 кастрычніка запланаваны грандыёзны «марш на Варшаву».

Старшыня польскай грамадскай ініцыятывы нацыянальна-кансерватыўнага кірунку «Марш незалежнасці» Роберт Банкевіч абвясціў пра стварэнне новай арганізацыі пад назвай «Нацыянальная гвардыя». Яна будзе складацца з грамадскіх актывістаў. Мэтай будзе абарона касцёлаў і іншых аб'ектаў ад нападаў левых пратэстоўцаў, якія выступаюць супраць рашэння Канстытуцыйнага суда аб абмежаванні права на аборт. Пра гэта паведаміла Polskie Radio 24.

На прэс-канферэнцыі, арганізаванай у панядзелак перад базілікай Святога Крыжа ў Варшаве, Роберт Банкевіч заявіў: «Мы ствараем свайго кшталту самаабарону — каталіцкую самаабарону, самаабарону цывілізацыі». Актывіст таксама нагадаў, што пратэстоўцы «абвясцілі вайну супраць улады і касцёла», таму стварэнне «Нацыянальнай гвардыі» выступае сіметрычным адказам гэтай заяве. «Калі гэта вайна, то мы прымаем выклік», — падкрэсліў Банкевіч.

Намеснік міністра аховы здароўя Польшчы Вальдэмар Краска назваў масавыя пратэсныя акцыі «біялагічнай бомбай» — натоўп, які выкрыквае лозунгі, з'яўляецца ідэальным месцам для распаўсюджвання каранавіруса. Тым больш што хуткасць перадачы інфекцыі ў апошнія два тыдні вельмі расце і зараз на высокім для краіны ўзроўні.

### Распаліць пажар

Лідар кіруючай партыі «Права і справядлівасць» Яраслаў Качыньскі выступіў з відэазваротам да нацыі, пракаментаваўшы пратэсты пасля рашэння Канстытуцыйнага суда аб забароне абортаў. Па словах Качыньскага, тыя, хто заклікае да несанкцыянаваных выступленняў, і тыя, хто ў іх удзельнічаюць, «ствараюць агульную небяспеку, тым самым здзяйсняюць сур'ёзнае злачынства». «У нас цяжкая стадыя эпідэміі. У нас забароненыя ўсякія сходы больш за пяць чалавек. У нас ёсць дзяржава, у якой гэтыя дэманстрацыі, безумоўна, будуць каштаваць жыцця многім людзям. Улады маюць не толькі правы, але і абавязаны супрацьстаяць такім падзеям», — сказаў ён.

Генеральны сакратар «Грамадзянскай платформы» Марцін Кервінскі напісаў у мікраблогу: «Яраслаў Качыньскі не здзівіў. Адзінае, што ён можа зрабіць, — гэта сеяць зло і нянавісць. Але заахвочваць грамадзянскую вайну — гэта новая якасць яго паслання». Вядомы грамадскі дзеяч Польшчы Ян Эпевак працягнуў думку: «Качыньскі заклікае сваіх прыхільнікаў абараняць царкву «любой цаной». Калі гэта не заклік да стварэння апалчэнцаў і грамадзянскай вайны, я не ведаю, што гэта такое. Нас чакае рэлігійная хунта ў бананавай рэспубліцы Польшча». Другі дэпутат ад «Грамадзянскай платформы» Ізабэла Ляшчына наогул назвала Качыньскага «насамрэч вар'ятам». Мэр Варшавы і экскандыдат у прэзідэнты ад апазіцыі Рафал Тшаскоўскі таксама не сароме́ўся ў эпітэтах: «Гэта надзвычай цынічны чалавек, пазбаўлены якіх-небудзь правілаў. Спачатку зладзіў пекла пасярод эпідэміі, а цяпер абвастрае канфлікт», — напісаў мэр польскай сталіцы ў «Фэйсбуку».

Падсумаваў водгукі на адрас Качыньскага яго ранейшы паплечнік па антыкамуністычнай барацьбе ў ПНР Уладзіслаў Фрасінюк. Колішні актывіст антыкамуністычнага падполля ў сацсетках звярнуўся да Качыньскага: «Ярэк, ні Бог, ні гонар, ні радзіма ў табе. Ты паставіў Ярузельскага ў прыклад, і ў выніку ты скончыш, як Ярузельскі». Цікава, што пра апошняга лідара сацыялістычнай Польшчы прыгадала яго дачка. Моніка Ярузельская апублікавала ўрывак з прамовы свайго бацькі ад 13 снежня 1981-га, калі ён абвясціў аб увядзенні ваеннага становішча ў Польшчы, дадаўшы: «У якасці папярэджання... Толькі тое, што тады мы не былі цалкам суверэннай дзяржавай».

Многія назіральнікі сцвярджаюць, што ўлада наўмысна пайшла на тое, каб запусціць дыскусію аб абортах менавіта цяпер. Ёсць меркаванне, што гэта павінна адцягнуць увагу польскага грамадства ад пагаршэння з кожным днём сітуацыі з эпідэміяй каранавіруса. «У перыяд самага жудаснага крызісу апошніх гадоў кіруючая партыя замест таго, каб засяродзіцца на аб'яднанні і салідарнасці палякаў, звяртаецца да тэмы абортаў, каб распаліць пажар і адцягнуць увагу грамадства ад катастрафічнай сітуацыі ў сістэме аховы здароўя і таго, што дзяржава не спраўляецца з эпідэміяй», — напісала ўплывовае ліберальнае выданне Gazeta Wyborcza.

**Пётр ДУНЬКО.**

# Извещение о проведении 30 ноября 2020 года торгов на право заключения договора оказания услуг по размещению рекламы на портале авторизации для идентификации абонентов WI-FI сетей

| № предмета торгов | Местонахождение WI-FI сетей, осуществляющих идентификацию абонентов через портал авторизации для трансляции интернет-баннера | Вид рекламного интернет-баннера и его характеристики | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с учетом НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Минск, пл. Привокзальная, 3, вокзал станции Минск-Пассажирский | **Полноэкранный интернет-баннер:** - длительность показа: 10с.; - поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg; - размеры: 468×60 пикселей; - оптимизация под экран устройства | 2 239,40 | 2 239,40 |
| | Минская область, г. Молодечно, ул. Вокзальная, 7, вокзал станции Молодечно | | | |
| | Минская область, г. Борисов, ул. Труда, 7а, вокзал станции Борисов | | | |
| | Минская область, г. Слуцк, ул. Вокзальная, 1, станция Слуцк | | | |
| | Минская область, г. Солигорск, ул. Ленинского Комсомола, 38, станция Солигорск | | | |
| | Минская область, г. Столбцы, станция Столбцы | | | |
| | Минская область, Несвижский район, г.п. Городея, ул. Вокзальная, 8, станция Городея | | | |
| | Минская область, Минский район, г. Заславль, станция Беларусь | | | |
| | Минская область, г. Жодино, ул. Партизанская, станция Жодино | | | |
| | Минская область, г. Смолевичи, ул. Вокзальная, 8, станция Смолевичи | | | |
| | Минская область, г. Дзержинск, ул. Вокзальная, станция Койданово | | | |
| | Минская область, г. Марьина Горка, ул. Октябрьская, станция Пуховичи | | | |
| | Минская область, Пуховичский район, г. Руденск, ул. Руденская, станция Руденск | | | |
| 2 | г. Гродно, ул. Буденного, 37, вокзал станции Гродно | **Полноэкранный интернет-баннер:** - длительность показа: 10с.; - поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg; - размеры: 468×60 пикселей; - оптимизация под экран устройства | 326,00 | 326,00 |
| | Гродненская область, г. Лида, ул. Труханова, 12В, вокзал станции Лида | | | |
| | Гродненская область, Островецкий район, посёлок Гудогай, ул. Привокзальная, 1, станция Гудогай | | | |
| | Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Комсомольская, 105, станция Сморгонь | | | |
| | Гродненская область, г. Волковыск, ул. Жолудева, 55Б, остановочный пункт Волковыск-Город | | | |
| | Гродненская область, г. Слоним, ул. Вокзальная, 11, станция Слоним | | | |
| 3 | г. Витебск, ул. Космонавтов, 8, вокзал станции Витебск | **Полноэкранный интернет-баннер:** - длительность показа: 10с.; - поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg; - размеры: 468×60 пикселей; - оптимизация под экран устройства | 674,00 | 674,00 |
| | Витебская область, г. Полоцк, ул. Октябрьская, 44, вокзал станции Полоцк | | | |
| | Витебская область, г. Орша, ул. Заслонова, 3а, вокзал станции Орша | | | |
| 4 | г. Брест, ул. Кижеватова, 1Б/1, вокзал станции Брест-Центральный | **Полноэкранный интернет-баннер:** - длительность показа: 10с.; - поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg; - размеры: 468×60 пикселей; - оптимизация под экран устройства | 1 075,60 | 1 075,60 |
| | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фроленкова, 13, вокзал станции Барановичи-Полесские | | | |
| | Брестская область, г. Лунинец, ул. Вокзальная, 6, вокзал станции Лунинец | | | |
| | Брестская область, г. Пинск, ул. Железнодорожная, 19, вокзал станции Пинск | | | |
| | Бресткая область, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 3б, станция Барановичи-Центральные | | | |
| | Брестская область, г. Ганцевичи, ул. Красноармейская, 7, станция Ганцевичи | | | |
| 5 | г. Могилев, Привокзальная площадь, 1, вокзал станции Могилев | **Полноэкранный интернет-баннер:** - длительность показа: 10с.; - поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg; - размеры: 468×60 пикселей; - оптимизация под экран устройства | 607,80 | 607,80 |
| | Могилевская область, г. Осиповичи, ул. Вокзальная, 18, вокзал станции Осиповичи | | | |
| | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Железнодорожная, 13, вокзал станции Бобруйск | | | |
| | Могилевская область, г. Кричев, ул. Пугачева, 6, вокзал станции Кричев | | | |
| | Могилевская область, г. Костюковичи, ул. Кулешова, 3В, станция Коммунары | | | |
| | Могилевская область, г. Шклов, ул. Вокзальная, 5, станция Шклов | | | |
| | Могилевская область, г. Быхов, ул. Вокзальная, 1, станция Быхов | | | |
| | Могилёвская область, Горецкий район, г. Горки, ул. Мира, 6, станция Погодино | | | |
| | Могилёвская область, Горецкий район, г. Климовичи, ул. Железнодорожная, 18, станция Климовичи | | | |
| 6 | г. Гомель, Привокзальная площадь, 3, вокзал станции Гомель | **Полноэкранный интернет-баннер:** - длительность показа: 10с.; - поддерживаемые форматы: gif, png, jpg, jpeg; - размеры: 468×60 пикселей; - оптимизация под экран устройства | 1 012,40 | 1 012,40 |
| | Гомельская область, г. Жлобин, Привокзальная площадь, вокзал станции Жлобин | | | |
| | Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Октябрьская, 30, вокзал станции Калинковичи | | | |
| | Гомельская область, Ельский район, Добрынский сельсовет, станция Словечно | | | |
| | Гомельская область, Добрушский район, городской поселок Тереховка, ул. Железнодорожная, станция Тереховка | | | |
| | Гомельский район, Гомельская область, Грабовский сельсовет, станция Терюха | | | |
| | Гомельская область, г. Буда-Кошелево, ул. Железнодорожная, 3, станция Буда-Кошелевская | | | |
| | Гомельская область, г. Житковичи, ул. Карла Маркса, 28, станция Житковичи | | | |
| | Гомельская область, г. Добруш, ул. Железнодорожная, 1, станция Добруш | | | |
| | Гомельская область, г. Речица, ул. Привокзальная, 9, станция Речица | | | |
| | Гомельская область, г. Рогачев, ул. Виссариона Белинского, 5, станция Рогачев | | | |
| | Гомельская область, г. Светлогорск, пер. Авиационный, 4, станция Светлогорск-на-Березине | | | |

***Необходимые условия оплаты услуг по размещению рекламы:***
*- на период действия договора оказания услуг стоимость одного показа составляет 0,20 бел. руб. (ноль рублей 20 копеек);*
*- стоимость услуг по размещению рекламы ежегодно пересчитывается путем увеличения на индекс потребительских цен, а также может быть изменена в случае изменения налогового законодательства;*
*- общая стоимость аренды виртуальных площадей в месяц для размещения рекламы определяется путем произведения стоимости 1 показа на количество показов в месяц (количество показов определяется ежемесячно исходя из фактического количества пользователей сетью WI-FI)*

Срок действия договора **с 10 декабря 2020 г. по 31 августа 2023 г**.

**Исполнитель услуги** – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский, г. Минск, пл. Привокзальная, 3.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Аукционные торги проводятся **30 ноября 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются с **02.11.2020 по 26.11.2020** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах;
- копию свидетельства о государственной регистрации организации или индивидуального предпринимателя;
- копию устава организации (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора);
- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится для каждого из предметов торгов).

Сумма задатка должна быть внесена не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, (назначение платежа – задаток для участия 30.11.2020 в торгах на право заключения договора оказания услуг по предмету торгов №_).

Лицо, подающее документы на участие в торгах, предъявляет документ, удостоверяющий личность. Представитель индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору торгов оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

*Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.*

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, предмет торгов продается участнику, подавшему единственное заявление на участие в торгах по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Иные условия торгов:**

победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- **в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов** внести на расчетный счет УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский сумму, за которую продан предмет торгов, за вычетом внесенной суммы задатка;
- **в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов** возместить коммунальному унитарному предприятию «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения (информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись);
- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор оказания услуг по размещению рекламы на портале авторизации для идентификации абонентов WI-FI сетей с УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станцией Минск-Пассажирский.

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефон для справок:** отдел аукционов – (017) 360-42-22, УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский – (017) 225-52-62.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы по наружной рекламе»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-56445 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание бани), обшей площадью 157,4 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, Петревичский с/с, аг. Петревичи, ул. Маяковского, 29Г

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424385210101000156, площадью 0,0518 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания бани), расположенном по адресу: Новогрудский р-н, Петревичский с/с, аг. Петревичи, ул. Маяковского, 29Г

Начальная цена продажи – 3 852 руб. (три тысячи восемьсот пятьдесят два рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 385 руб. (триста восемьдесят пять рублей)

**Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 18 ноября 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grino.by/aukcion.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 10.06.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 16 ноября 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Дополнительная информация http://grino.by**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-47034 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание механической мастерской), общей площадью 325,3 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/1 мехмастерская в районе д. Евсеевичи.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 423683200027000025, площадью 1,3546 га (назначение – для обслуживания здания механических мастерских), расположенном по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, в районе д. Евсеевичи. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0314 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,1053 га.
Обременений со стороны третьих лиц нет.
Начальная цена продажи лота – 2 100 руб. (две тысячи сто рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 210 руб. (двести десять рублей)

ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 420/С-47032 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание гаража), общей площадью 817,5 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/2 гараж в районе д. Евсеевичи.
Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 423683200027000026, площадью 1,1350 га (назначение – для обслуживания здания гаража), расположенном по адресу: Лидский р-н, Дитвянский с/с, в районе д. Евсеевичи. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0485 га.
Обременений со стороны третьих лиц нет.
Начальная цена продажи лота – 9 060 руб. (девять тысяч шестьдесят рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 906 руб. (девятьсот шесть рублей)

ЛОТ 4: капитальное строение, инв. № 420/С-47477 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 141,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 28А.
Лот № 4 расположен на земельном участке, кадастровый № 423683200004000128, площадью 0,0310 га (назначение – для размещения объектов розничной торговли), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Докучаева, 28А.
Обременений со стороны третьих лиц нет.
Начальная цена продажи лота – 65 400 руб. (шестьдесят пять тысяч четыреста рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 6 540 руб. (шесть тысяч пятьсот сорок рублей)

ЛОТ 5: капитальное строение, инв. № 420/С-47651 (назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения, наименование – здание столярной мастерской), общей площадью 231,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, 16/2, столярная мастерская в районе д. Новицкие.
Лот № 5 расположен на земельном участке, кадастровый № 423684300055000138, площадью 1,2057 га (назначение – для обслуживания здания столярной мастерской), расположенном по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, 16/2, столярная мастерская в районе д. Новицкие. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема), площадью 1,2057 га; земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), площадью 1,2057 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0314 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадью 0,0303 га.
Обременений со стороны третьих лиц нет.
Начальная цена продажи лота – 9 960 руб. (девять тысяч девятьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 996 руб. (девятьсот девяносто шесть рублей)

**Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, тел. 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 18 ноября 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grino.by/aukcion.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 30.07.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 16 ноября 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Дополнительная информация http://grino.by**

Людзі і лёсы

# ЯК ЗНІК ПРАЦЯГ РАМАНА ЯНКІ НЁМАНСКАГА «ДРАПЕЖНІКІ», ПРЫСВЕЧАНАГА ЛЁСУ РАБОЧЫХ ШКЛОЗАВОДА

## Беларускі акадэмік працаваў грузчыкам у порце і падарыў Мінску трамвай



**Кожны год у канцы кастрычніка мы ўспамінаем сумную дату. У ноч з 29-га на 30-е ў 1937 годзе былі забітыя некалькі дзясяткаў беларускіх паэтаў, пісьменнікаў, навукоўцаў... Сярод тых, хто загінуў у той жудасны час, ёсць адзін пісьменнік, сёлетні юбіляр, які ўвайшоў у гісторыю пад імем Янка Нёманскі. Давайце ўспомнім гэтага чалавека, а тым самым — усіх, хто быў забіты і не паспеў даспяваць свае песні.**

Насамрэч яго звалі Іван Пятровіч, нарадзіўся ён 130 гадоў таму. Сям'я, якая жыла ў вёсцы Шчорсы Навагрудскага павета, была тыпова сялянская: беднасць і шмат дзяцей. У 1901 годзе маці Івана памерла ад сухотаў. Следам за ёй «от полного истощения», гэта значыць, ад голаду, памерлі пяцёра братоў і сёстраў, а таксама бабуля, дзядуля і дзядзька. Так што да 1906 года ў жывых засталіся толькі Іван, яго бацька і цётка. Бацька ажаніўся з удавою з двума дзецьмі, але і тыя хутка памерлі. Удавец з'ехаў у Расію на заробкі, і больш пра яго нічога не вядома. Івана выратавала тое, што ён паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Але калі атрымаў месца вясковага настаўніка, гэтым не задаволіўся. Далей ён паступае ў Петраградскі ўніверсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт. Іван потым напіша ў біяграфіі: «Жыў я «в углу», гэта значыць, здымаў не асобны пакой, а куток. На жыццё зарабляў, працуючы грузчыкам у порце, на Калашнікаўскай набярэжнай. А яшчэ расчышчаў ад снегу і лёду трамвайныя шляхі.

Вучобу перарвалі вайна і рэвалюцыя. Давялося паваяваць і ў царскай арміі, і ў Чырвонай. У 1918 годзе Янка Нёманскі вяртаецца ў Петраград і пачынае працаваць у Беларускім нацыянальным камісарыяце — аддзеле Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцяў РСФСР. Тут здарыліся дзве вызначальныя падзеі. Пятровіч уступіў у партыю эсэраў і пасябраваў з бальшавіком Змітром Жылуновічам, ён жа — паэт Цішка Гартны, якому было наканавана ўзначаліць беларускую рэспубліку. Пятровіч стаў нават сурэдактарам газеты «Дзянніца», першай савецкай газеты, якая выходзіла на беларускай мове. Прычынай яго сімпатыі да эсэраў было тое, што яны рэзка выступалі супраць Брэсцкага міру, згодна з якім нямецкім акупантам аддавалася частка Беларусі.

За эсэрскае мінулае Янку Нёманскага пасля выключаць з камуністычнай партыі. А Цішка Гартны, з якім разам рэдагавалі газету «Дзянніца», стане ягоным правадніком у літаратуру. Нёманскі ўслед за сябрам уступіць у «Маладняк», тады ўвойдзе ў праўленне літаратурнага аб'яднання «Полымя».

А ў 1922 годзе ў часопісе «Полымя» з'явілася апавяданне «Над Кроманню» — дэбют пісьменніка Янкі Нёманскага. Пісаў пра радзіму — возера Кромань непадалёк ад Налібоцкай пушчы, дзе родныя Шчорсы.

«Цудоўнае гэта возера... Я ж пражыў тут змалку сярод гэтых сумных лясоў ды балот; тут навокал траха не на 20 вёрст няма ні аднае вёскі: усё лес ды лес, балоціна з правалінамі, дзе вада чорная як сажа і дзе ніхто не мераў дна».

Па вяртанні на Беларусь Іван Пятровіч працуе намеснікам старшыні Дзяржплана БССР, становіцца членам ЦВК БССР, акадэмікам Беларускай акадэміі навук. Між іншым, ён паспрыяў з'яўленню ў Мінску першага трамвая. Калі падчас партыйных чыстак яму давядзецца пісаць прашэнне на імя сакратара ЦК КП(б)Б Мікалая Гікалы, сярод уласных заслуг згадае: «Не случайно, что моя работа в Госплане часто бралась в штыки со стороны части старых специалистов, оказавшихся впоследствии вредителями, например: ...по вопросу мелиорации, где я требовал быстрейшего освоения мелиорированных площадей, по вопросам коммунального хозяйства (строительства трамвая в Минске, которое я один защищал в Госплане)»...

Пачыналася эпоха рэпрэсій. На сакавіцкім пленуме ЦК КП(б)Б 1937 года старшыня Саўнаркама Галадзед заявіў, што з 1 студзеня 1932 года да 1 студзеня 1937 года колькасць выключаных з партыі склала 42 працэнта ад агульнай колькасці, і даў зразумець, што «лічыць гэта перагібам». А першы сакратар ЦК КП(б)Б Гікала, наадварот, у запісцы на імя Яжова прапаноўваў выключаных з партыі высяляць з БССР.

Пройдзе трохі часу. Будзе арыштаваны і расстраляны Гікала, Галадзед скончыць жыццё самагубствам. Цішка Гартны арыштаваны, даведзены катаваннямі да вар'яцтва і становіцца самазабойцам. Усяго праз два тыдні, 26 красавіка 1937 года, арыштавалі Янку Нёманскага. Вось фрагмент пратакола вобыску, праведзенага пры арышце:

«Изъято:

4 тетради, разная переписка, блокнотов 11 штук, 10 книг под ред. Петровича, книга «Война с белополяками», журн. «Полымя» — 25 штук, «Красная новь» — 2 шт., 2 книги под редакцией Некрашевича, 1 книга под ред. Дунца, 1 книга под ред. Гартного и разн. книги — 7 шт., вся переписка и документы...»




Тады была канфіскаваная другая частка рамана Янкі Нёманскага «Драпежнікі», прысвечанага лёсу рабочых шклозавода. Літаратуразнаўцы дасюль гадаюць, дзе той рукапіс.

Вось урывак з успамінаў пісьменніка Васіля Хомчанкі аб знаходжанні ў мінскай турме НКУС: «...у той камеры сядзелі паэты, яны чыталі складзеныя там паэтычныя радкі. Па суседстве з нашай камерай — даведаліся па перастуку — пакутаваў Мікола Хведаровіч, у другой — Міхась Чарот, Юрка Лявонны. У маёй камеры знаходзіліся ажно тры літаратары: пісьменнік і акадэмік Янка Нёманскі, паэты Янка Туміловіч і Масей Сяднёў — студэнт пэдагагічнага інстытута, таленавіты хлопец».

З той камеры ацалела двое.

А 9 верасня 1937 года начальнік следчага аддзела УДБ НКУС БССР Волчак накіраваў сакратару КП(б)Б Волкаву ліст: «По поручению Народного Комиссара Внутренних дел БССР тов. Бермана направляю Вам замечания арестованных вредителей Бондаря и Петровича по вопросу о создании областей в БССР».

Праблема раянавання рэспублікі стаяла вельмі востра, Нёманскі займаўся ёю яшчэ да арышту. Магчыма, арыштаваных «спяцоў» прыцягнулі да гэтай справы па загадзе зверху. У такім выпадку ім маглі стварыць больш-менш прыдатныя для работы ўмовы. Магчыма, яны па сваёй ініцыятыве вырашылі даказаць савецкай уладзе сваю карыснасць.

Цікава, што Янка Нёманскі прапануе ўтварыць сярод іншых абласцей Бабруйскую.

Заканчваецца нататка «шкодніка Пятровіча» так:

«Эта наметка только первоначальная. При проработке нужно уточнить вопрос отнесения того или иного района к областям (напр. Толочинский, Рогачевский, Кормянский и др.), а также и целесообразность дальнейшего существования некоторых районов в нынешних их границах».

Іншымі словамі, аўтар намякае, што ён яшчэ спатрэбіцца для далейшай распрацоўкі.

Аднак гэтая хітрасць не дапамагла.

Янку Нёманскага расстралялі 30 кастрычніка 1937 года разам з Тодарам Кляшторным і Юліем Таўбіным. Жонка, Глафіра Дзмітрыеўна, якая працавала старшым эканамістам Наркамата лясной гаспадаркі, была арыштаваная 4.11.1937 г. у Мінску па адрасе вул. 11 Ліпеня, д. 18/7, кв. 2. Была асуджана на восем гадоў і трапіла ў Акмалінскі лагер для жонак ворагаў народа. Заставалася трое дзяцей. Старэйшы, Андрэй, які нарадзіўся ў 1922 годзе, студэнт тэхнікума, быў асуджаны на пяць гадоў. Хлопчык не дажыў да шаснаццаці, памёр у Паўночна-Уральскім лагеры. Глафіру Пятровіч вызвалілі 25.11.1945 г. Усю сям'ю пасля рэабілітавалі.

А вось сяброўства з эсэрамі партыя пісьменніку не даравала. У пратаколе № 84 пасяджэння бюро ЦК КПБ ад 10.09.1957 г. гаворыцца:

«Решением Минского горкома КП(б)Б от 7 декабря 1935 года Петрович И. А. исключен из партии за скрытие при вступлении в ВКП(б) своего пребывания в эсеровской организации и как принятый в партию с нарушением устава ВКП(б).

Петрович Иван Андреевич исключен из партии в 1935 году правильно, как принятый в партию с нарушением устава ВКП(б). Отказать в посмертной реабилитации его в партийном отношении».

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**



Возера Кромань, дзе прайшло дзяцінства пісьменніка.

## УСЕ «АВАНТУРЫ ПРАНЦІША ВЫРВІЧА» — РАЗАМ!

**У Маскве ў легендарным праекце «Рэтра бібліятэка прыгод і навуковай фантастыкі» пабачылі свет пераклады на рускую мову адразу двух раманаў беларускай пісьменніцы і рэдактара аддзела культуры «Звязды» Людмілы РУБЛЕЎСКАЙ.**




Пад адной вокладкай — «Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата» і «Авантуры Вырвіча, з банды Чорнага Доктара». Гэта чацвёртая і пятая кнігі Л. Рублеўскай пра беларускага Уленшпігеля XVIII стагоддзя. **Перакладчык — Павел ЛЯХНОВІЧ**, які, дарэчы, жыве і працуе ў Пінску. Авантурна-прыгодніцкі цыкл гэтай кнігай не завяршаецца. У Выдавецкім доме «Звязда» рыхтуецца да выдання шостая кніга пра героя, які даўно палюбіўся беларускаму чытачу, — «Авантуры Вырвіча, Лёдніка і Чорнай Меланхоліі». Папярэдне раман быў надрукаваны ў жнівеньскім, верасеньскім, кастрычніцкім нумарах часопіса «Полымя».

Некалькі слоў пра серыю і маскоўскае выдавецтва «Престиж Бук», якое заўважыла адметны твор беларускай пісьменніцы. Зараз у серыі, якая бярэ свой пачатак ад «маладагвардзейскага» праекта (кнігі пад «фірменным» афармленнем выходзілі з 1936 года: творы Майн Рыда, Фенімора Купера, Аляксандра Яфрэмава...), пабачылі свет «Шэрлак Холмс з каментарыямі і ілюстрацыямі» Артура Конан Дойля, «Дэман Сакрата» Генадзя Прашкевіча, «Паветраны карабель» Аляксандра Бяляева, збор твораў Валерыя Пераляшына... Серыя карыстаецца надзвычайнай папулярнасцю, прыцягвае ўвагу тысяч і тысяч чытачоў.

Спадзяёмся, што і творы іншых беларускіх пісьменнікаў пабачаць свет у прыгодніцкай серыі маскоўскага выдавецтва. Магчыма, не толькі сучасная літаратура, але і гістарычная, захапляльная проза Уладзіміра Караткевіча, найперш — яго «Чорны замак Альшанскі».

**Сяргей ШЫЧКО.**

Кніжны гасцінец

# «ПАДУМАЕШ — ПАЭТ! УСЁ РОЎНА ДА НАС, У АНАТАМІЧКУ, ПРЫВЯЗУЦЬ!..»

**Янка Брыль. Збор твораў. Том 6. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2020.**




«Няўжо гэта абавязкова — усаджваючы ў літаратурнае карыта і свой лыч, спачатку кашкануць ім суседа справа ці злева, а то і таго і другога? Хоць карыта гэтае аж надта доўгае, шырокае...

Падумалася так, калі чытаў яшчэ адно маладжавае інтэрв'ю з уступна-недарэчнымі і проста хамскімі «заўвагамі» пра тых, хто піша інакш, чым ён, ці не тое, што ён, прыгрэты пераважна, больш уяўным поспехам».

Як вам гэты запіс з цыкла «Пошукі слова» народнага пісьменніка Янкі Брыля? Той вызначаўся інтэлігентнасцю, быў майстрам лірычных мініяцюр... Але быў і на язык востры, калі хацеў, а ўжо ў сваіх дзённікавых запісах ды зацемках мог прыпячы любога... Мусіць, недарэмна загадаў, каб пасля смерці яго дзённікі захоўваліся пад замком гадоў пяцьдзясят...

У шостым томе збору твораў пісьменніка ўвайшлі дазволеныя да друку запісы і мініяцюры 1945—1992 гадоў — ад тонкіх апісанняў прыроды да з'едлівых каментароў пра вядомых асоб. Васмісот старонак разваг, падставa якіх — падарожжы, сустрэчы, прачытаныя кнігі, успаміны дзяцінства, выпадкова падгледжаныя сцэнкі... Вядома, у тых мініяцюрах, якія выдаваліся ў савецкі час, месцамі адчуваецца прыгладжанасць... Ёсць і «паравозы» — абавязковыя згадкі пра Леніна, партыю, Кастрычнік, якія ў савецкія часы забяспечвалі дазвол да друку... Брыль, аднак, і тут стараецца неяк выйсці на агульначалавечыя тэмы. Чытаючы, вы мімаволі ўступіце ў дыялог з аўтарам. Вось ён у 1976-м крытычна выказваецца пра творчасць Быкава: «Дажыць да світання», «Яго батальён» — ці гэта ўжо стомленасць ад спеву на адзін матыў, ці тут у пэўнай меры агалілася штосьці з таго, з чым я нязгодны?»

У чым аўтар саступіў — часам апускае імёны. «Малады вясковы дурыла ад першага сутыкнення з медыцынай, як студэнт-першакурснік, гаварыў калісьці, нешта хутка пасля вайны: «А што там ваш N? Падумаеш — паэт! Усё роўна да нас, у анатамічку, прывязуць!..» З той самай мудрасцю ён, пераростак, ужо не юнак, а мужчына, пазычыў у мяне даволі ладную суму «на тыдзень, па-зямляцку», каб ніколі, як аказалася, не паказацца ні з грашыма, ні так сабе».

Брылю было пра што пісаць... У ягоным жыцці здарыліся і вайна, і палон, і партызаншчына. Ён выдатны стыліст, адзін з тых, хто назапашваў скарбы беларускай мовы. Вось у наваполацкай гасцініцы пачуў ад дзеда: «А цяпер неціхота такая, дык гэта добра!» — і занатоўвае новае слоўца — «неціхота», шум, галаснасць...

«Або добра, або нічога».

Вядома, правільна, што не для таго я многіх перажыў, каб іх аббрэхваць.

Аднак лепш ужо нічога, чым такое добра, дзе пішацца з тым самым слёзным ці слінявым пафасам пра Авеля і Каіна, пра мастака і графамана».

**Владимир Немирович-Данченко. О театре. Выдавецтва «Азбука», Масква, 2019.**




«Драматург мог быть желаннейшим в Малом театре, а среди настоящих писателей чувствовал себя конфузно».

Менавіта так апісвае Уладзімір Немірович-Данчанка становішча тэатральнага жыцця ў Расіі ў канцы пазамінулага стагоддзя. Заканы ў тэатр, ён не стаў ні матэматыкам, ні юрыстам, хоць вучыўся ва ўніверсітэце на гэтых спецыяльнасцях. Напачатку сцвердзіўся як тэатральны крытык, потым з'явіліся п'есы, апавяданні, аповесці, раманы... Але яго літаратурны набытак сёння забыты. Немірович-Данчанка ўвайшоў у гісторыю як паплечнік вялікага Станіслаўскага, разам з ім стварaў МХАТ, працаваў над славутай «сістэмай». А пачалося ўсё з адной доўгай размовы пра тое, што абодвух не задавальняе...

Калі разлаваны Немірович сказаў кіраўніку тэатраў, што ідзе зараз да Станіслаўскага і хоча прапанаваць яму адкрываць новы тэатр, чыноўнік адказаў:

«Алексеев-Станиславский? Да, знаю. Я бы взял его в заведующие монтировочной частью».

Чэхаў, Горкі, Меерхольд, Ярмолава, Талстой... Шмат падрабязнасцяў, якія мог занатаваць толькі сведка. Напрыклад, як давялося змагацца з пагардлівым стаўленнем публікі да артыста і яго працы, з акцёрамі, якія не разумелі, навошта столькі рэпетыцый. Давялося дамаўляцца пра ўмовы супрацоўніцтва і з уладным Станіслаўскім — «два медведя в одной берлоге не уживутся». Калі Немірович прапанаваў увесці правіла — заўсёды гаварыць адзін аднаму праўду ў вочы, Станіслаўскі збянтэжыўся і адмовіўся. Маўляў, у свой адрас ён такога сцярпець не змогжа. А вось тэатр прыехаў на гастролі ў Вену, і дзве маладзенькія вучаніцы — Коранева і Коанен — вырашылі вырвацца з-пад апякунства і пасяліцца асобна. Жытла не знайшлі, затое ледзь не трапілі ў бяду, бо іх прымалі за «начных матылькоў», і раніцай, пракалаціўшыся на вакзале, прыгажуні вярнуліся да сваіх настаўнікаў. Немировічу-Данчанку давялося на пару са Станіслаўскім даваць прачуханца свавольніцам. А мясцовыя антрэпрэнёры ўсё дзівіліся: што за бацькоўскія адносіны да артыстачак? Карацей, аматарам тэатра чытаць абавязкова.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

*Выданні для агляду прапанаваныя кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.06 | 17.41 | 9.35 |
| Віцебск — | 7.58 | 17.26 | 9.28 |
| Магілёў — | 7.56 | 17.30 | 9.34 |
| Гомель — | 7.48 | 17.32 | 9.44 |
| Гродна — | 8.19 | 17.58 | 9.39 |
| Брэст — | 8.16 | 18.02 | 9.46 |

### Месяц

*Першая квадра 23 кастрычніка. Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.*** *Івана, Лонгіна, Яўгена.*
***К.*** *Віялеты, Серафіны, Міхала, Нарцыза, Тодара.*



Фота Надзеі ЗУЕВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Бацька піша сваёй дачцэ:**

**— Галінка, і колькі ж зарабляе твой новы кавалер?!**

**— Ой, тата, кіньце вы гэтыя свае пытанні... Ён тое ж самае пытаў пра вас з мамай...**

— Каханая, дзе ў нас ляжыць цукар?

— Цукар ляжыць у бляшанцы з-пад кавы, на якой напісана «соль», але цяпер яго там няма.

**— Што б вы хацелі ад жыцця?**

**— Ой, зусім няшмат — добры домік каля мора з відам на сапраўднага мужчыну!**

— Які самы спрыяльны час для збору яблыкаў?

— Калі сабака навязаны.




Даты | Падзеі | Людзі

### 29 КАСТРЫЧНІКА

У краіне

**1905** год — нарадзіўся Барыс Якаўлевіч Вішкароў, акцёр, рэжысёр, педагог, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1929-м скончыў Дзяржаўныя эксперыментальныя майстэрні пры Маскоўскім камерным тэатры. Працаваў у тэатрах Масквы, з 1944-га — у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры Беларусі. Выступаў пераважна ў ролях класічнага рэпертуару. Працаваў на радыё і тэлебачанні як сцэнарыст і рэжысёр. Аўтар артыкулаў па пытаннях тэатральнага мастацтва і драматургіі.



**1945** год — нарадзіўся Мікалай Станіслававіч Казак, беларускі навуковец, акадэмік НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1965** год — у гарадскім пасёлку Обаль Шумілінскага раёна адкрыты музей Обальскага камсамольскага падполля, філіял Шумілінскага гісторыка-краязнаўчага музея.

У свеце

**1565** год — нарадзіўся друкар Іван Фёдараў. Разам з Пятром Мсціслаўцам яны выдалі ў Маскве «Часаслоў», які выкарыстоўваўся пры пачатковым навучанні грамаце.

**1705** год — нарадзіўся Герард Фрыдрых Мілер, рускі гісторык і археолаг, член Пецярбургскай АН. У 1733—1743 гадах прымаў удзел у Вялікай сібірскай экспедыцыі капітан-камандора Вітуса Берынга, арганізаванай Акадэміяй навук, у падарожжы па тэрыторыі Югры ў складзе другой Камчацкай (Вялікай Паўночнай) экспедыцыі. У 1766-м быў прызначаны кіраўніком Маскоўскага архіва Калегіі замежных спраў. Выдаў фундаментальную працу «Гісторыя Сібіры».

**1880** год — нарадзіўся Абрам Фёдаравіч Іофэ, расійскі вучоны-фізік, адзін з заснавальнікаў савецкай школы фізікаў-атамшчыкаў і арганізатараў фізічных даследаванняў у СССР, акадэмік АН СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Аўтар навуковых прац па трываласці, пластычнасці, электраправоднасці цвёрдага цела. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Ленінскай прэміі (пасмяротна).

Так гаварылі...

**ЛЕАНАРДА ДА ВІНЧЫ:**
*«Заўжды там, дзе не хапае разумных аргументаў, іх замяняе крык».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3247.
Нумар падпісаны ў 19.30 28 кастрычніка 2020 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12